КАНСТАНЦІН СІМАНАЎ І МАГІЛЁЎ 4

НАСТАЎНІК ГОДА: ПРА САКРЭТЫ ПРАФЕСІІ 7

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

28 ЛІСТАПАДА 2020 г. СУБОТА № 233 (29347)

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля ПУЗЫРЭВІЧ, загадчыца кафедры сацыяльнай і сямейнай псіхалогіі Інстытута псіхалогіі БДПУ імя Максіма Танка:

«Педагог павінен валодаць разам з прафесійнымі ведамі тымі маральнымі характарыстыкамі, якія змогуць паказаць дзіцяці, што яно можа абапірацца на гэтага чалавека, давяраць яму, узаемадзейнічаць з ім на роўных. Педагог, які стварае ў калектыве такі мікраклімат, здольны весці за сабой і паказвае: сёння вы гэта можаце зрабіць разам са мной, але заўтра наступіць момант, калі вы зможаце зрабіць гэта самі. Жаданне прытрымлівацца гэтага шляху вельмі важнае».

КАРАТКА

- **Работы прадстаўнікоў БДУ заваявалі дыпломы розных ступеняў на II Міжнародным форуме маладых дызайнераў «Прастора дызайну».**
- Нацыянальны банк са студзеня 2021 года будзе праводзіць штомесячныя аўкцыённыя аперацыі па выдачы крэдытаў.
- **Дабрачынная выстаўка творчасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі «Сэрца на далоні» праходзіць у выставачнай зале музея гісторыі Магілёва.**
- Журы вызначыла пераможцаў радыёконкурсу чытальнікаў паэтычных твораў Караткевіча.
- **Ізраільскія хасіды падзякавалі беларускай дзяржаве за дапамогу паломнікам у верасні.**
- У штаб-кватэры НАК Беларусі падвялі вынікі рэспубліканскага конкурсу «Алімпійскі агонь запальвае сэрцы».

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

На такіх людзях трымаецца і суверэнітэт, і незалежнасць, і наша краіна

Як ідзе барацьба за жыцці і здароўе «ковідных» пацыентаў, Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку расказалі ў 6-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска

Тэма каранавіруса ўжо год не пакідае стужкі навін. Калі кітайцы ў студзені закрывалі на каранцін горад Ухань, здавалася, гэтая геаграфічна далёкая і невядомая навала нас абміне. Але ўжо праз месяц першы выпадак заражэння COVID-19 рэгіструецца ў Беларусі, і з таго часу пачынаецца адчайная барацьба з нябачным ворагам, які ўвесь час змяняе свае сімптомы і падстройваецца пад метады лячэння. У сталіцы Беларусі, якая адным з першых гарадоў у краіне прыняла ўдар «ковіду» на сябе, на «перадавой» была 6-я гарадская клінічная бальніца. Таму менавіта з гэтай лакацыі Прэзідэнт пачаў сваё знаёмства з практыкай лячэння каранавіруса ў краіне.

Фота БелТА.

СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сініцы зімуюць у Маі

Невялікая вёска Май Рэчыцкага раёна ў апошнія гады ператварылася ў дачны пасёлак — у бацькоўскія хаты нашчадкі прыязджаюць хіба ў вяснова-восеньскі сезон. А вось Аляксандр ГАРМАНЕНКА — былы нафтавік (вадзіцель і газазваршчык), калі выйшаў на пенсію, вярнуўся на малую радзіму і стаў сапраўдным гаспадаром: на яго падворку гадуюцца авечкі, трусы, чароды свойскай птушкі. Агароджу, браму і вокны старэнькай бацькоўскай хаты Аляксандр Іванавіч упрыгожыў сілуэтамі птушак — сімваламі жывой і багатай прыроды.

Кузня чэмпіёнаў

Не матываць — любоў

«Вікторыя», якая робіць з Гродна баскетбольную сталіцу

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Гродна — горад з багатай не толькі культурнай, але і баскетбольнай гісторыяй. У многім гэта заслуга трэнера Аляксандра Шымкавяка, які даў дарогу ў вялікі спорт многім знакамітым баскетбалісткам. Цяпер справу легендарнага спецыяліста працягвае яго жонка Вікторыя ДАЦУН, галоўны трэнер гродзенскай каманды «Вікторыя» і нацыянальнай жаночай зборнай U-16.

«Вікторыя» ўваходзіць у своеасаблівы баскетбольны холдынг — клуб «Прынёманне». У яго структуру ўключаны дзве асноўныя дарослыя каманды — мужчынская «Гродна-93» і жаночая «Алімпія». А ў жаночай «Вікторыі» і мужчынскай камандзе «Прынёманне» гуляе моладзь. «Вельмі добра, што ў нас функцыянуе такая структура. У «Вікторыі» гуляюць спартсменкі, якія яшчэ вучацца ў школе ці заканчваюць яе, але ў дарослых камандах ім пакуль рана выступаць.

СТАР. 12

На такіх людзях трымаецца і суверэнітэт, і незалежнасць, і наша краіна

ЗАРОБКІ ЗА РЫЗЫКУ

Галоўны ўрач бальніцы Ігар Юркевіч расказаў Прэзідэнту, што медыцынскую дапамогу хворым на каранавірус аказвае больш як тысяча супрацоўнікаў. З пачатку эпідэміі ў клініцы дапамаглі пяці з паловай тысячы людзей з інфекцыяй COVID-19. Цяпер тут лечацца 767 пацыентаў, з іх 28 — у рэанімацыі.

Сярэдняя зарплата ва ўстанове за кастрычнік склала звыш 2,2 тысячы рублёў, пры гэтым ва ўрачоў — больш як 3,3 тысячы. «Ва ўрачоў рэанімацыі зарплата каля 7-9 тысяч рублёў, — падкрэсліў Ігар Юркевіч. — Людзі прывыклі да добрай падтрымкі і з задавальненнем працуюць. Маладыя спецыялісты пабудавалі кватэры за кошт гэтых надбавак».

«Яны робяць вялікую справу. Калі чалавек працуе ў «чырвонай» зоне, няхай ён і атрымлівае (высокую зарплату. — **«Зв.»**)», — адказаў Прэзідэнт.

Заслухаўшы даклады, Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з арганізацыяй лячэння і накіраваўся ў блок з пацыентамі, якія захварэлі на каранавірус. Пасля кіраўнік дзяржавы таксама наведаў Гарадскі цэнтр трансфузіялогіі.

У бальніцы Прэзідэнт зноў выказаўся пра жаданне польскіх улад прыцягнуць у сваю краіну беларускіх медыкаў. «Нам трэба сваіх хворых лячыць, але мы гатовыя і ім дапамагчы. Але толькі давайце пачалавечы: вам трэба — мы да вас адправім брыгаду, дапаможам», — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка.

ПЕРААДОЛЕЦЬ НЯПРОСТЫ ПЕРЫЯД

Пасля наведвання карпусоў Прэзідэнт сустрэўся з працоўным калектывам 6-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска і адказаў на пытанні ўрачоў.

На сустрэчы Прэзідэнт адзначыў, што лячэнне «ковід»-хворых абыходзіцца бюджэту ў значныя грошы. За год на барацьбу з каранавірусам выдаткуюць амаль мільярд долараў. Ён адзначыў, што беларуская медыцына выпрацавала сваю сістэму ў лячэнні хворых на каранавірус. «Мы прайшлі няпросты шлях, мы ведаем, што рабіць, як лячыць і як выходзіць з гэтай складанай сітуацыі», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт плануе азнаёміцца з лячэннем «ковід»-хворых ва ўсіх абласцях Беларусі. З 6-й бальніцы Мінска пачынаюцца камандзіроўкі першай асобы дзяржавы па медыцынскіх установах краіны, дзе лечаць «ковідных» пацыентаў, ананасаваў ён. «Шасцёрку» ён назваў бальніцай, якая цягне асноўную нагрузку па каранавірусных хворых у краіне.

«Будзе правільна, калі мы пабудзем тут. Я спланаваў пабываць ва ўсіх абласцях. Калі востры перыяд, трэба ўдасканальваць сістэму. Мы бачым, чаго не хапае», — сказаў беларускі лідар.

«УРАЧЫ І НАСТАЎНІКІ — ГЭТА ТОЕ, НА ЧЫМ ТРЫМАЕЦЦА НАША ДЗЯРЖАВА»

«Урачы і настаўнікі — гэта тое, на чым трымаецца наша дзяржава. Таму я вельмі перажываю і жорстка рэагую, калі настаўнікі, замест таго каб вучыць студэнтаў, цягнуць іх невядома куды, калі ўрач (некаторыя) у гэты складаны час, замест таго каб лячыць людзей, выходзіць і пачынае нешта дэманстраваць», — выказаўся Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы пра ўрачоў, якія да апошняга змагаюцца за жыцці людзей, ён падкрэсліў: «Перад такімі мы схіляемся і будзем схіляцца. Гэта сапраўдныя ўрачы. Я вам за гэта вельмі ўдзячны. Дзе б я ні быў, дзе б ні служыў, я заўсёды буду памятаць такіх герояў. ***На такіх людзях трымаецца і суверэнітэт, і незалежнасць, і наша краіна»,*** — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што ўрачы — асаблівыя людзі, якія не маюць права на эмоцыі.

СУПАКОІЦЦА І ЛЯЧЫЦЬ ЛЮДЗЕЙ

Па словах Прэзідэнта, атлусценне, цукровы дыябет, астма, хваробы сэрца — асноўныя захворванні, з-за якіх людзі паміраюць, калі падхопліваюць каранавірус.

«Давайце не будзем слухаць пісак, якія сёння ў інтэрнэце пачынаюць каціць хвалю. Смяротнасць ніколі не схаваеш. Можаш паставіць дыягназ «астма», «пнеўманія» і гэтак далей, але агульную колькасць смяротнасці ніколі не схаваеш. Скончыцца год, і ўся статыстыка будзе бачная, а медыкі дакладна будуць ведаць паказчыкі па смяротнасці. Але чаму «хайпуюць» і «посцяцца» на гэтым? Вострая тэма, трэба расштурхаць яе», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, у сучасным свеце немагчыма схаваць інфармацыю па захворванні ці смяротнасці ад каранавіруса.

«Трэба супакоіцца і лячыць людзей. Галоўнае — захаваць жыцці», — дадаў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што пры любых цяжкасцях сродкі для заснавання лініі па вытворчасці вакцыны ад «ковіду» знойдуць. Прэзідэнт расказаў, што Уладзімір Пуцін прапанаваў штам вакцыны і дадаў, як толькі спецыялісты падрыхтуюць адпаведны варыянт вытворчасці, лідар краіны імгненна арганізуе ўсе працэсы. ***«Лінія неабходная. Гэта я вам гарантую: пры любых цяжкасцях мы знойдзем сродкі, каб паставіць дадзеную лінію»,*** — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Яшчэ незразумела, але мне здаецца, што гэта зараза застанецца назаўсёды. І нам, як ад грыпу, давядзецца (ад яе. — **«Зв.»**) прышчапляць. Таму трэба стварыць гэту вакцыну», — упэўнены Прэзідэнт.

Верагодна вытворчую лінію вакцыны наладзяць на прадпрыемстве «Белмедпрэпараты».

Прэзідэнт даручыў таксама прапрацаваць пытанне аб павелічэнні колькасці валанцёраў, што дапамагаюць медыкам.

РОЎНЫЯ ЎМОВЫ

Падчас размовы з медыкамі Аляксандр Лукашэнка расказаў, што з будучага года плануюць змяніць сістэму атрымання вышэйшай медыцынскай адукацыі. Акцэнт зробяць на мэтавае накіраванне пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

«Ты накіраваў у медуніверсітэт абітурыента, ён вучыцца, ты яму дапамагаеш, плаціш стыпендыю — забірай яго на работу», — сказаў кіраўнік краіны.

На яго думку, такая сістэма дапамагае стварыць роўныя ўмовы для абітурыентаў з буйных гарадоў і малых вёсак.

«Мэтавікі зоймуць асноўнае месца ў ВНУ, каб нам укамплектаваць і раённыя бальніцы. Як гэта было заўсёды — сапраўдны ўрач знізу ішоў. Няхай у Мінску, але знізу, не пад крылом маці ці таты, а за кошт свайго розуму», — заявіў Прэзідэнт.

Падчас сустрэчы закранулі таксама жыллёвае пытанне. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў сваім жыллі маюць патрэбу прадстаўнікі многіх прафесій, не толькі ўрачы. Ён нагадаў, што цяпер асаблівая ўвага аддаецца будаўніцтву арэндных кватэр, развіццю гарадоў-спадарожнікаў. Прэзідэнт прапануе будаваць жыллё для медыкаў і на ўзор тыпавых дамоў у пасёлку Бараўляны Мінскага раёна.

Па яго словах, такія дамы будуюцца за год. Гэта танны і выгадны варыянт для дзяржавы. «Лічы, двухпакаёвая кватэра. Так, невялікія кватэры і пакоі, але варыянт, пакуль чалавек бярэ крэдыт, працуе... А пры сённяшнім заробку многія сталі будаваць жыллё ў крэдыт. Скарысталіся магчымасцю, малайцы», — дадаў беларускі лідар.

Прэзідэнт заявіў, што будзе настойваць і на развіцці арэнднага жылля. ***«Усё замыкаецца на жыллі, наколькі ў нас будзе магчымасць, будзем падтрымліваць маладых спецыялістаў і будаваць жыллё.*** Але на Мінск асабліва не арыентуйцеся, будзем размяркоўваць людзей», — рэзюмаваў ён.

«НІЯКУЮ КАНСТЫТУЦЫЮ Я ПАД СЯБЕ НЕ РАБЛЮ»

Прэзідэнта спыталі пра работу рэгіянальных штабоў па барацьбе з пандэміяй. У першую хвалю яны дапамаглі хутка вырашыць усе праблемныя пытанні, лічыць кіраўнік дзяржавы. Узначальваюць іх кіраўнікі рэгіёнаў разам з упаўнаважанымі Прэзідэнта.

«Я вельмі станоўча ацэньваю работу кіраўніцтва нашых абласцей, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Вы заўважылі, што ўрад у нас некалькі ад гэтага (прыняцця супрацьэпідэмічных мер. — **«Зв.»**) адхілены, але ***ўрад жалезна адказвае за эканоміку. Не будзе працаваць эканоміка, ніякі «ковід» мы не вылечым, нікога не выратуем».***

Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што існуючая вертыкаль улады дазваляе хутка вырашаць праблемы і зараз, падчас досыць рэзкага росту колькасці інфіцыраваных.

«Вы заўважылі, што асноўны ўдар нашых «пратэстуноў» наносіцца па Прэзідэнце і па вертыкалі ўлады», — звярнуў ён увагу. У якасці прыкладу беларускі лідар прывёў прапановы апазіцыі зрабіць выбарнымі пасады дзяржаўных служачых, дырэктараў прадпрыемстваў. Ён нагадаў, што такі вопыт быў падчас кіравання Савецкім Саюзам Міхаіла Гарбачова, што, на думку Аляксандра Лукашэнкі, і прывяло да распаду дзяржавы.

«Я кажу: гэта ўжо без мяне. Займайцеся гэтай дэмакратыяй ужо без мяне. Хоць нам, вядома, Канстытуцыю трэба новую», — дадаў Прэзідэнт і растлумачыў: нам патрэбна Канстытуцыя, якая абароніць краіну ад разбурэння ў выпадку, калі да ўлады прыйдзе чалавек, які альбо знарок пажадае краіну разбурыць, альбо незнарок будзе спрабаваць гэта зрабіць.

Беларускі лідар спыніўся на прапановах абрання парламента па партыйных спісах і нагадаў, як у абраным па такім прынцыпе Вярхоўным Савеце ў пачатку 90-х гадоў не маглі прыйсці да згоды па важных пытаннях альбо прымаліся рашэнні, якія супярэчылі, на яго думку, меркаванню большасці людзей. Як прыклад — прыняцце першай дзяржаўнай сімволікі незалежнай Беларусі.

Партыі могуць падзяліць грамадства і прывесці да вулічных сутыкненняў, а работу парламента паралізаваць, дадаў Прэзідэнт. ***«Ну калі вы гэтага хочаце, народ за гэта прагаласуе,*** — так і будзе, — сказаў ён пры гэтым. — ***Клянуся, так і будзе. Ніякую Канстытуцыю я пад сябе не раблю.*** У новай Канстытуцыі я ўжо з вамі Прэзідэнтам працаваць не буду».

Яшчэ адно абяцанне Аляксандра Лукашэнкі — недапушчэння фальсіфікацый падчас галасавання за змяненні ў Канстытуцыю. «Нават калі буду ведаць, што гэта будзе не тое, што я хачу. Чаму? ***Таму што беларускі народ павінен прайсці тое, што ён павінен прайсці. Лепш цяпер, без вайны. Горш, калі нам гэту вайну падкінуць»,*** — падкрэсліў Прэзідэнт.

ДАПЛАТЫ ЗАСТАНУЦЦА

Адно з пытанняў датычылася далейшай падтрымкі медыкаў, якія працуюць з хворымі на COVID-19 пацыентамі.

Даплаты ніхто не здыме, але гэта не галоўнае, адказаў беларускі лідар. Сярэдні заробак па сістэме аховы здароўя, дзякуючы «ковідным» выплатам, дасягнуў узроўню, які планаваўся на канец наступнай пяцігодкі. «І для мяне цяпер важна, як захаваць гэты ўзровень», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Адначасова кіраўніцтва краіны вырашае праблему «падцягвання» заробкаў у іншых бюджэтных сферах хоць бы да паловы ўзроўню заробкаў медыкаў.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў краіне створана добрая сістэма аховы здароўя, пачынаючы ад бальніц сястрынскага догляду ў вёсках і заканчваючы навуковымі цэнтрамі сусветнага ўзроўню ў сталіцы. На яго думку, менавіта існуючая ў Беларусі сістэма ўлады дазволіла хутка вырашыць праблему забеспячэння сродкамі індывідуальнай аховы медыкаў падчас першай хвалі пандэміі: тады 110 прадпрыемстваў легпрама працавалі на выкананне гэтага заказу.

Што датычыцца параўнання з заробкамі медыкаў за мяжой, Прэзідэнт пагадзіўся, што так, там атрымліваюць больш, але дзеля гэтага працуюць без выхадных, маюць мінімальныя адпачынкі, плацяць за адукацыю і зусім іншыя грошы — за камунальныя паслугі.

* * *

Дзмітрый Піневіч назначаны міністрам аховы здароўя з пасады выконваючага абавязкі. Пра падпісаны адпаведны ўказ кіраўнік краіны паведаміў у канцы размовы з медыкамі. «Вялікі аванс у сувязі з «ковідам», — пажартаваў Прэзідэнт.

Завяршаючы размову, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што просіць некалькіх рэчаў ад медыкаў: ***«Галасавалі за мяне, ці не, але я, ваш Прэзідэнт сёння, прашу разумення. Нам неабходна выратаваць нашу краіну — гэта галоўнае.*** Гэты прамежак часу, хоць бы паўгода, пратрымайцеся і не хварэйце, бо вас замяніць вельмі складана».

Марыя ДАДАЛКА,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Апроч «ковіду»

Шмат разоў падчас размовы з медыкамі Аляксандр Лукашэнка спыняўся на тэме пратэстаў. Ён растлумачыў сваю рэакцыю на тое, што адбываецца ў краіне ў гэты няпросты год. З-за спынення сусветнай эканомікі падчас пандэміі нам складана прадаваць на знешніх рынках сваю прадукцыю. Што датычыцца палітычнай сітуацыі, яе, па словах кіраўніка дзяржавы, знарок абвастраюць знешнія гульцы.

«Адразу пасля выбараў мне прыйшлося прымаць упершыню за чвэрць стагоддзя рашэнне аб прывядзенні ў поўную баявую гатоўнасць паловы арміі, — паведаміў Прэзідэнт. — Мы аб'яўлялі мабілізацыю, каб папоўніць рады Узброеных Сіл. У нас армія ў звычайны час — 65 тысяч, а ў ваенны час мы разгортваем 500 тысяч, у мабілізацыі. Вось асобныя часткі, вы бачылі, прыйшлося выводзіць у Гродна».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, навошта гэта было зроблена. Ён зачытаў апошнія зводкі, якія атрымаў ад спецыяльных службаў. Цытаты сведчаць аб тэрытарыяльных прэтэнзіях Польшчы на частку Беларусі і знешняй падтрымцы беларускага пратэснага руху, аб закліках польскага боку да НАТА стварыць спецыяльныя сілы бяспекі ў складзе армій краін Балтыі і Польшчы, аб польскім інтарэсе ў перамозе рэвалюцыі ў Беларусі. Агаворваліся тактыка дзеяння беларускай апазіцыі і мэты пераканаць шэраг краін прыпыніць эканамічныя адносіны з Беларуссю. Прапаноўвалася стварыць у Варшаве аператыўную групу па сачэнні за беларускімі падзеямі і падрыхтоўцы рэкамендацый для кіраўнікоў краін ЕС. Гаварылася пра неабходнасць Польшчы быць гатовай да ваеннага ўмяшання ва ўнутраныя справы Беларусі і пра папярэджанне Расіі аб неўмяшанні.

Іншыя дакументы беларускі лідар прывёў, каб аргументаваць, што каардынацыйнаму савету, які цяпер вяшчае з-за мяжы, насамрэч не патрэбная канстытуцыйная рэформа. Як, па яго словах, раней не патрэбна былі пералічванне галасоў і паўторныя выбары.

«Ім не патрэбная новая Канстытуцыя, бо калі мы прымем яе, там будзе разгрупаванне ўлады, але ім патрэбны прэзідэнт з цяперашняй уладай», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Гэта дазволіць тым, хто рвецца да ўлады, звярнуцца па ваенную дапамогу ў НАТА, лічыць ён. А дапамога ім спатрэбіцца, бо народ, нават калі не разбярэцца адразу, хутка зразумее свае страты і ўзбунтуецца, дадаў беларускі лідар. І тады тэрыторыя краіны можа аказацца пад кантролем знешніх сіл.

«Стратэгічны інтарэс Захаду — стварэнне празаходняга рэжыму ў Расіі, «беларускі выпадак» можа служыць у якасці аднаго з элементаў у гэтай стратэгіі. ***Кіраўніцтва Еўрасаюза лічыць, што зараз ёсць гістарычны шанс спыніць расійскі ўплыў,*** — працытаваў чарговую шыфроўку Аляксандр Лукашэнка. — ***Вось у чым галоўны сэнс. І мы — перашкода на гэтым шляху. На нас павінны патрэніравацца».***

Незалежнасць — вельмі дарагая рэч, падкрэсліў Прэзідэнт.

«Калі беларускі народ гатовы ўтрымліваць гэтую незалежнасць, змагацца за яе, чаго б гэта ні каштавала, давайце будзем змагацца», — рэзюмаваў ён.

Парламенцкі дзённік

Супрацьдзеянне распаўсюджванню COVID-19 і мадэльныя законы

Фота БелТА.

Парламенцкая дэлегацыя на чале са спікерам Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ прыняла ўдзел у пасяджэннях савета і 51-м пленарным пасяджэнні Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, якія прайшлі ў рэжыме відэаканферэнцыі.

На пасяджэнні савета была пераабрана яго старшыня — Валянціна Мацвіенка, якая ўзначальвае заканадаўчую ўладу Расійскай Федэрацыі, бо тэрмін паўнамоцтваў яе на чале МПА СНД заканчваўся.

Ад імя Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Качанава падзякавала спікеру МПА СНД Валянціне Мацвіенцы за работу па ўмацаванні ролі Міжпарламенцкай Асамблеі. Яна адзначыла, што асамблея карыстаецца вялікім аўтарытэтам на міжнароднай арэне і з яе меркаваннем лічацца партнёры ў іншых краінах. Таксама спікер верхняй палаты беларускага парламента выказала ўпэўненасць, што ініцыятыва, плённая дзейнасць расійскай калегі на пасадзе старшыні МПА СНД, якая мае на мэце развіццё міжпарламенцкага супрацоўніцтва, будзе працягнута і надалей.

На пасяджэнні МПА парламентарыі разгледзелі 21 пытанне. Адной з галоўных тэм стала заканадаўчае забеспячэнне захадаў, што прымаюцца ў дзяржавах — удзельніцах СНД у сувязі з пандэміяй COVID-19. Дарэчы, у рабоце савета ўзяў удзел дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Ханс Клюге.

На пасяджэнні была прынята сумесная заява Савета МПА СНД і Еўрапейскага бюро САЗ «Аб ролі парламентаў у супрацьдзеянні COVID-19». У дакументе падкрэсліваецца асноўная задача парламентарыяў у перыяд пандэміі — заканадаўча забяспечыць рэалізацыю стратэгіі па супрацьдзеянні распаўсюджванню інфекцыі, выратаванні жыццяў і зніжэнні адмоўных наступстваў захворвання.

Таксама на парадку дня былі пытанні стану і перспектыў эканамічнай інтэграцыі на еўразійскай прасторы і яе нарматыўна-прававое забеспячэнне, падрыхтоўка назіранняў за выбарамі ў органы дзяржаўнай улады ў краінах СНД у 2021 годзе, стварэнне экспертнага савета па навуцы і адукацы пры МПА СНД.

Акрамя таго, на савеце зацверджаны склад пастаянных камісій асамблеі, разгледжаны план работы на наступны год, пытанні фінансавання дзейнасці гэтай структуры.

Адным з яркіх момантаў Савета МПА СНД стала ўзнагароджванне старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталлі Качанавай адмысловым медалём Міжпарламенцкай Асамблеі «За ўмацаванне парламенцкага супрацоўніцтва» за асаблівы ўклад у развіццё парламенцкага супрацоўніцтва, умацаванне дэмакратыі, забеспячэнне правоў і свабод грамадзян у краінах — удзельніцах СНД.

Трэба сказаць, што такім медалём узнагароджваюцца парламентарыі, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, грамадзяне і арганізацыі іншых краін, службовыя асобы і супрацоўнікі органаў СНД, міжнародныя служачыя іншых міжнародных арганізацый за асаблівы ўнёсак у развіццё нацыянальнага заканадаўства і парламентарызму.

Яшчэ адна ўзнагарода — прэмія МПА СНД імя Чынгіза Айтматава — у 2020 годзе прысуджана літаратуразнаўцу, пісьменніку, заслужанаму дзеячу культуры нашай краіны, акадэміку НАН Беларусі Уладзіміру Гніламёдаву.

Што датычыцца правядзення пленарнага пасяджэння, падчас яго парламентарыі прынялі 27 тэматычных мадэльных прававых актаў, па якіх беларускім бокам унесена больш за 80 заўваг і прапаноў.

Асамблеяй зацверджаны праект міжнароднай дамовы — Канвенцыі аб захаванні аб'ектаў культурнай спадчыны дзяржаў — удзельніц СНД, якая замацоўвае асноўныя механізмы ўзаемадзеяння краін Садружнасці па захаванні і выкарыстанні аб'ектаў культурнай спадчыны, асабліва ў перыяд сацыяльных і прыродных катаклізмаў. Дакумент накіраваны ў Выканаўчы камітэт СНД для разгляду ў адпаведным парадку.

Адзначым, што прыняты падчас пасяджэння асамблеі мадэльны Выбарчы кодэкс для дзяржаў — удзельніц СНД будзе садзейнічаць далейшаму развіццю прававой базы і датычыцца правядзення выбараў у адпаведнасці з міжнароднымі выбарчымі стандартамі.

У эканамічным блоку пытанняў прыняты мадэльныя законы аб інжынірынгу, інжынернай справе, будаўніцтве нерухомых аб'ектаў на долевай аснове.

У сферы абароны і бяспекі профільнай Пастаяннай камісіяй МПА СНД прадстаўлены мадэльныя законы аб бежанцах, пакрыцці нанесенай шкоды грамадзянам, якія пацярпелі ад злачынстваў, новыя рэкамендацыі па тыпалогіі злачынстваў, якія здзяйсняюцца з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій.

У гуманітарным раздзеле асамблеяй прыняты мадэльны Працоўны кодэкс, законы аб школьным спорце і допінгу ў спорце, узгоднены слоўнік тэрмінаў у галіне адукацыі.

Адзначым, што ў складзе нацыянальнай дэлегацыі — члены Прэзідыума Савета Рэспублікі Таццяна Рунец і Сяргей Рачкоў, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Ігар Марзалюк і Віктар Семяняка, намеснік генеральнага сакратара Савета МПА СНД — паўнамоцны прадстаўнік Нацыянальнага сходу Беларусі Віктар Когут.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Выхоўваць патрыётаў сваёй краіны

Рэспубліканскі патрыятычны цэнтр будзе створаны ў Брэсцкай крэпасці

На гэтым тыдні стала вядома, што на базе абласнога Цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі ў Брэсцкай крэпасці будзе створаны аналагічны рэспубліканскі. Цяпер названы цэнтр з'яўляецца філіялам Брэсцкага дзяржаўнага абласнога цэнтра маладзёжнай творчасці.

Патрыятычны цэнтр аб'ядноўвае намаганні пошукавікаў, гістарычных рэканструктараў, краязнаўцаў, прадстаўнікоў кадэцкага і ваенна-патрыятычнага руху ў рабоце па захаванні гістарычнай спадчыны і грамадзянска-патрыятычнага выхавання. Цэнтр стаў паспяховым праектам абласной улады і маладзёжнай арганізацыі. Ён адкрыты на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці ў адрэстаўраваным будынку, дзе з верасня 1939 года да пачатку вайны размяшчаўся штаб 125-га стралковага палка. Цяпер у двухпавярховым будынку створаны ўсе ўмовы для вывучэння гісторыі Брэста і крэпасці, а таксама для заняткаў ваенна-прыкладнымі відамі спорту, абслугоўвання турыстычных груп.

— Ідэю цэнтра мы з калегамі і аднадумцамі актыўна прасоўвалі, калі я яшчэ працаваў у абласным камітэце БРСМ, — расказаў **дырэктар абласнога Цэнтра маладзёжнай творчасці Віктар ІВАНОЎ.** — А цяпер, можна сказаць, задуманае рэалізоўваем на практыцы. Летам на базе патрыятычнага цэнтра паспяхова праведзеныя змены спартыўнага лагера «Патрыёт». І вось што магу адзначыць, паводле сваіх назіранняў. Калі школьнікі, падлеткі пабудуць у нас не толькі на экскурсіі, але правядуць цэлую змену, яны сталеюць на вачах. Цяперашнія дзеці маюць вельмі прыблізнае ўяўленне аб мінулай вайне, якое найчасцей фарміруецца пад уплывам прагледжаных імі фільмаў. А вось тут, калі ў музеях ім раскажуць пра канкрэтныя факты з абароны, прывядуць прыклады стойкасці і мужнасці — гэта выклікае іншыя эмоцыі. Мы працягваем размову і маем магчымасць паказаць: вось на гэтым месцы адстрэльваўся знясілены маёр Гаўрылаў, тут загінуў камісар Фамін, а ў гэтым падвале здзяйснялі свой подзвіг ваенныя медыкі.

Тады ў дзяцей узнікаюць многія пытанні, ім на дапамогу прыходзяць дарослыя. З імі спрачаюцца, абмяркоўваюць, і тым самым вучаць думаць і ацэньваць падзеі. Менавіта тут многія выхаванцы цэнтра прымаюць рашэнне, напрыклад, пачаць займацца спортам, каб заўсёды быць у форме і ў выпадку патрэбы стаць абаронцам Радзімы. Патрыятызм узрастае на свядомасці, заснаванай на веданні сваёй гісторыі, павазе да мінулага свайго краю і яго сучаснасці.

З дзецьмі ў цэнтры працуюць маладыя і вопытныя педагогі. Сярод іх краязнаўцы, рэканструктары, былыя вайскоўцы. Асаблівую цікавасць у вучняў выклікае пляцоўка для ваенна-тактычных гульняў. Любяць выхаванцы лясныя паходы, квэсты па тэрыторыі крэпасці.

Як паведаміў журналістам **міністр абароны Рэспублікі Беларусь Віктар ХРЭНІН,** Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі будзе створаны пад эгідай ваеннага ведамства на базе абласнога цэнтра ўжо ў наступным годзе.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Тэхналогіі

Оптавалакно — да кожнага дома

Да канца года ўсе населеныя пункты краіны з колькасцю хатніх гаспадарак сто і больш будуць забяспечаны оптавалаконнай сеткай. Аб гэтым расказаў першы намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Павел ТКАЧ.

— Яшчэ 25 гадоў таму дамашні тэлефон лічыўся раскошай, асабліва ў сельскай мясцовасці. Абумоўлена гэта было не тым, што ён дарагі, а тым, што адсутнічала тэхнічная магчымасць. За мінулы перыяд змянілася многае, перш за ўсё тэхналогіі і запыты людзей, але нязменная засталася пазіцыя дзяржавы і нацыянальнага аператара сувязі — забяспечыць ёю ўсе слаі насельніцтва. Зараз будаўніцтва валаконна-аптычных ліній сувязі да ўсіх населеных пунктаў з колькасцю хатніх гаспадарак сто і больш завяршаецца. Гэта значыць, задача па тэлефанізацыі сельскага насельніцтва ў нас вырашаецца, і яна з'яўляецца адной з прыярытэтных.

Намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях РУП «Белтэлекам» Сяргей ТУРОМША расказаў, што на сёння рэалізаваны маштабныя мерапрыемствы для забеспячэння неабходнай інфраструктуры, каб прапанаваць найбольш шырокі спектр паслуг сувязі па ўсёй краіне.

— Па-першае, гэта пракладка оптавалаконных сетак. На сёння прадпрыемства ўжо забяспечыла іх падвядзенне да ўсіх кватэр шматпавярховай забудовы. Цяпер у любым населеным пункце — як у сталіцы, так і ў абласным цэнтры, невялікім раённым цэнтры або гарадскім пасёлку — у шматпавярховым доме ёсць магчымасць падключыць паслугі сувязі на базе такіх сетак. У далейшым плануем іх правядзенне да індывідуальных прыватных забудоў і ў сельскіх населеных пунктах. Задача на найбліжэйшыя тры гады — ахапіць такія з колькасцю домаўладанняў ад 50 і вышэй. Ужо больш за 50 працэнтаў маюць праведзеныя оптавалаконныя сеткі, але трэба выканаць работу ў поўным аб'ёме.

Сяргей Туромша адзначыў, што на сёння асаблівая ўвага аддаецца пракладцы оптавалакна да бальніц, паліклінік, ФАПаў, сельскіх школ.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

САЗ: з-за недахопу фізнагрузкі штогод памірае да 5 мільёнаў чалавек

Да 5 млн чалавек памірае ў свеце за год па прычынах, звязаных з недахопам фізічных нагрузак. Пра гэта паведаміла агенцтва Associated Press са спасылкай на абноўленую версію інструкцый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (САЗ) у сферы фізічнага здароўя. «Фізічная актыўнасць любога тыпу і працягласці можа палепшыць здароўе і самаадчуванне, але чым больш, тым лепш, — заявіў дырэктар дэпартамента САЗ па пытаннях умацавання здароўя Руедыгер Крэх. — Калі вы праводзіце шмат часу седзячы на рабоце ці ў школе, вам трэба больш фізічнай актыўнасці, каб супрацьстаяць разбуральным наступствам пасіўнага спосабу жыцця». АР адзначае, што дапоўнены варыянт рэкамендацый САЗ выйшаў у той момант, калі мноства людзей у свеце сутыкаюцца з ізаляцыяй на фоне пандэміі каранавіруса. Пры гэтым, паводле падлікаў САЗ, цяпер час 25 % дарослых і 80 % моладзі адчувае недахоп фізічнай актыўнасці, а крызіс з COVID-19 толькі пагоршыў сітуацыю. САЗ раіць дарослым аддаваць фізічным нагрузкам 2-2,5 гадзіны на тыдзень, а падлеткам — 1 гадзіну ў дзень. Рэгулярная фізічная актыўнасць, растлумачылі ў САЗ, гэта важны фактар, каб пазбегнуць сардэчнага прыступу, дыябету і раку. Яна таксама дапамагае супраць дэпрэсіі і трывожнасці, паляпшае работу мозга. Па даных САЗ, недахоп фізічнай актыўнасці ў часткі насельніцтва абыходзіцца сістэмам аховы здароўя розных краін у $54 млрд у год, страты праз зніжэнне прадукцыйнасці працы ацэньваюцца яшчэ ў $14 млрд.

У Шатландыі налета мяркуюць правесці рэферэндум аб незалежнасці

Першы міністр Шатландыі Нікола Стэрджэн разлічвае правесці другі рэферэндум аб незалежнасці рэгіёна ў наступным годзе адразу пасля выбараў у Холіруд (мясцовы парламент). Пра гэта паведаміла газета The Times са спасылкай на тэлеканал ITV Border. Стэрджэн, якая з'яўляецца таксама лідарам Шатландскай нацыянальнай партыі (ШНП), удакладніла, што «яшчэ не ўстанавіла дакладную дату». Аднак яна ўпэўненая, што ў Шатландыі павінна быць магчымасць правесці рэферэндум адразу пасля таго, як да работы прыступіць новае скліканне мясцовага парламента, выбары ў які адбудуцца ў маі наступнага года. Паводле даных апытання, праведзенага ў кастрычніку сацыялагічнай кампаніяй Ipsos MORI, колькасць жыхароў Шатландыі, якія выступаюць за яе аддзяленне ад Злучанага Каралеўства, вырасла да рэкорднага ўзроўню. Атрыманне незалежнасці гатова падтрымаць 58 працэнтаў рэспандэнтаў.

Унутры егіпецкай мумііі знайшлі незвычайны артэфакт

Амерыканскія навукоўцы выявілі незвычайны артэфакт унутры двухтысячагадовай егіпецкай мумііі. Адпаведны рэліз апублікаваны ў навуковым часопісе Journal of the Royal Society Interface. Аўтары даследавання вырашылі вывучыць мумію з дапамогай паскаральніка сінхратронных часціц, каб атрымаць падрабязныя звесткі аб яе змесціве. У выніку было выяўлена некалькі дзясяткаў дробных прадметаў, уключаючы сямімілімётровы артэфакт, зроблены з мінералу кальцыту. Ён знаходзіўся побач з жыватом у месцы разрэзу, праз які выдаляліся органы падчас муміфікацыі. На думку даследчыкаў, прадмет з'яўляецца амулетам, які быў змешчаны ў гэтым месцы спецыяльна для «духоўнай абароны» мумііі. Навукоўцы выказалі здагадку, што артэфакт мае выгляд жука-скарабея, які быў распаўсюджанай формай для амулетаў у Старажытным Егіпце.

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 8 (107)

Салдаты Перамогі

«ДА ШТЫКА ЁН ПЯРО ПРЫРАЎНЯЎ»

28 лістапада 2020 года спаўняецца 105 гадоў з дня нараджэння вядомага рускага пісьменніка, ваеннага карэспандэнта і журналіста Канстанціна Сіманава. Вельмі многае Канстанціна Міхайлавіча звязвала з беларускай зямлёй: тут адбылося яго станаўленне як франтавога журналіста, тут упершыню на ўсю моц загучала тэма, якая стала ў яго творчасці галоўнай, — тэма Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта Сіманаў у гарачыя баявыя ліпеньскія дні 1941 года на ўвесь свет праславіў гераічны подзвіг абаронцаў Магілёва.

Франтавы здымак Канстанціна Сіманава.

Будучы пісьменнік нарадзіўся ў 1915 годзе ў Петраградзе. Бацька прапаў без вестак у Першую сусветную вайну, хлопчыка выхаваў айчым, выкладчык ваеннага вучылішча Аляксандр Іванішаў. Дзяцінства Кірыла (сапраўднае імя Сіманава) прайшло ў ваенных гарадках. Пасля заканчэння сямі класаў юнак вучыўся ў фабрычна-заводскім вучылішчы, затым працаваў токарам у Саратаве і Маскве, куды сям'я пераехала ў 1931 годзе. У 1938 годзе Канстанцін Сіманаў скончыў Літаратурны інстытут, у тым жа годзе быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў СССР. Падчас вучобы ён пачаў пісаць вершы, якія былі надрукаваныя ў часопісах «Молодая гвардия» і «Октябрь».

Да 1941 года ў Канстанціна Сіманава ўжо быў вопыт франтавога карэспандэнта: падчас баёў з японцамі на рацэ Халхін-Гол ён асвятляў падзеі ў газеце «Героическая красноармейская». У аўтабіяграфіі Сіманаў пісаў: «З восені 1940 года да чэрвеня 1941-га вучыўся на курсах ваенных карэспандэнтаў пры Ваенна-палітычнай акадэміі. Скончыў іх у сярэдзіне чэрвеня 1941 года, атрымаўшы воінскае званне інтэнданта другога рангу. 24 чэрвеня 1941 года прызваны з запасу і з загадам Палітупраўлення Чырвонай Арміі выехаў для работы ў газеце «Боевое знамя» Трэцяй арміі ў раён Гродна. У сувязі з сітуацыяй на фронце да месца прызначэння не дабраўся і быў прызначаны ў рэдакцыю газеты Заходняга фронту «Красноармейская правда». Працаваў там да 20 ліпеня 1941 года. Адначасова як няштатны карэспандэнт пасылаў ваенныя карэспандэнцыі ў «Известия».

Летам 1941 года Сіманаў напісаў адзін з самых вядомых вершаў «Чакай мяне», які заваяваў сэрцы чытачоў і стаў для іх адначасова і гімнам, і малітвай. Салдаты выралі яго з газет, перапісвалі, седзячы ў акопах, вучылі на памяць і пасылалі ў лістах жонкам, сяброўкам і нявестам. Яго знаходзілі ў нагрудных кішэнях параненых і забітых... Па сведчаннях удзельнікаў вайны, гэты верш (пасля пакладзены на музыку) усяляў надзею ў тых, хто верыў, што іх чакаюць, і ў тых, хто чакаў байцоў з фронту.

Жди меня, и я вернусь,
Всем смертям назло.
Кто не ждал меня, тот пусть
Скажет: «Повезло».
Не понять, не ждавшим им,
Как среди огня
Ожиданием своим
Ты спасла меня.

Па заданні рэдакцыі газеты «Известия» Канстанцін Сіманаў і фотакарэспандэнт Павел Трошкін 12 ліпеня 1941 года прыбылі ў Магілёў, у размяшчэнне 172-й стралковай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра М. Ц. Раманава. Палітаддзел злучэння накіраваў іх у 388-ы стралковы полк. Тут Сіманаў атрымаў першае сваё сур'ёзнае баявое і журналісцкае хрышчэнне на Буйніцкім полі, калі на подступах да Магілёва яго абаронцы ў няроўнай бітве прыпынілі фашысцкія бранятанкавыя калоны групы армій «Цэнтр». Тут ён сустрэўся з воінамі-абаронцамі, якія вызначыліся ў гэтым баі, з камандзірам палка палкоўнікам Сямёнам Куцепавым, пасля размовы з якім адзначыў: «Не ведаю, можа быць, гэта няправільна з ваеннага пункту гледжання, але ў тую хвіліну, паглядзеўшы на героя, я паверыў, што мы абавязкова пераможам».

Нягледзячы на шматразовую перавагу саперніка ў жывой сіле і тэхніцы, часці Чырвонай Арміі, байцы народнага апалчэння, насельніцтва горада паказалі тут узоры стойкасці, гераізму і мужнасці, вернасць воінскаму абавязку. Асабліва жорсткія баі ішлі на Буйніцкім полі, дзе танкавым нямецкім армадам супрацьстаялі пехацінцы 388-га стралковага палка Сямёна Куцепава і агнявыя разлікі 340-га артпалка палкоўніка Івана Мазалава.

Пра герояў гэтай бітвы ваенны карэспандэнт Кастанцін Сіманаў расказаў у нарысе «Гарачы дзень», апублікаваным у газеце «Известия» 20 ліпеня 1941 года. У газетным матэрыяле з палёў бітвы быў надрукаваны сенсацыйны рэпартаж і паказана панарама дзясяткаў падбітых варожых танкаў. Каля стэндаў з газетай «Известия» ў тыя дні збіраліся вялізныя натоўпы чытачоў, людзі радаваліся, гэта было лепей за любую агітацыю...

Камандуючы Заходнім франтам генерал Андрэй Яроменка ў раздзеле «Гераічны Магілёў» мемуараў «На пачатку вайны» (М.: Наука, 1965), адзначаючы заслугі 172-й стралковай дывізіі, падкрэсліваў:

«Гэтая гераічная дывізія заслугоўвае не меншай удзячнасці савецкага народа, чым доблесныя абаронцы Брэсцкай крэпасці, бо воіны дывізіі выстаялі на палявых умацаваннях, створаных імі з дапамогай мясцовага насельніцтва, дваццаць тры дні, стрымліваючы напор танкавай армады Гудэрыяна. Яны пакінулі горад па загадзе свайго камандзіра толькі тады, калі фронт адкаціўся на добрую сотню кіламетраў ад беларускага Мадрыда, як называлі Магілёў яго доблесныя абаронцы».

Бітва пад Магілёвам узрушыла Канстанціна Сіманава і лягла ў аснову рамана-трылогіі «Жывыя і мёртвыя». «Я не быў салдатам, быў усяго толькі карэспандэнтам, аднак у мяне ёсць кавалачак зямлі, які мне век не забыць, — поле пад Магілёвам, дзе я ўпершыню ў ліпені 1941 года бачыў, як нашы на працягу аднаго дня падбілі і спалілі 39 нямецкіх танкаў...», — пісаў пазней Канстанцін Сіманаў.

У гады вайны Сіманаў напісаў п'есы «Рускія людзі», «Чакай мяне», «Так і будзе», аповесць «Дні і ночы», дзве кнігі вершаў «З табой і без цябе» і «Вайна». Шырокую вядомасць яму прынесла лірыка ваенных гадоў: вершы «Ты памятаеш, Алёша, дарогі Смаленшчыны...» і «Чакай мяне», а таксама зборнік «З табой і без цябе». Як ваенны карэспандэнт ён пабываў на многіх франтах, прайшоў па землях Румыніі, Балгарыі, Югаславіі, Польшчы і Германіі, быў сведкам апошніх баёў за Берлін. Пасля вайны з'явіліся яго зборнікі нарысаў «Лісты з Чэхаславакіі», «Славянская дружба», «Югаслаўскі сшытак», «Ад Чорнага да Баранцава мора. Запіскі ваеннага карэспандэнта».

Радзіма высока ацаніла заслугі пісьменніка: Канстанцін Сіманаў удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы, узнагароджаны шматлікімі ордэнамі і медалямі, уганараваны Дзяржаўнымі прэміямі СССР. Многія гады займаў пасаду сакратара праўлення Саюза пісьменнікаў СССР.

Сучаснікі сцвярджалі, што сэрца пісьменніка Сіманава заўсёды належала Магілёву. У пасляваенныя гады ён неаднаразова прыязджаў сюды, падоўгу хадзіў па Буйніцкім полі і іншых месцах былых баёў, сустракаўся з ветэранамі вайны, выступаў перад рабочымі і студэнтамі, вёў перапіску з магілёўцамі. Пісьменнік склаў завяшчанне, у якім прасіў пасля смерці развеяць яго прах над Буйніцкім полем — побач з воінамі, якія загінулі на гэтым полі бітвы.

28 жніўня 1979 года пісьменніка не стала. Паводле завяшчання, прах Канстанціна Сіманава быў развеяны над Буйніцкім полем, а 25 лістапада 1980 года тут адбылося адкрыццё мемарыяльнага знака. На тыльным баку каменя замацаваная шыльда з надпісам: «К. М. Сіманаў. 1916—1979. Усё жыццё ён памятаў гэта поле бою 1941 года і завяшчаў развеяць тут свой прах».

У памяць пра пісьменніка-франтавіка яго імем названа адна з вуліц горада, у Магілёве праводзяцца міжнародныя «Сіманаўскія чытанні», прымеркаваныя да дня нараджэння літаратара.

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прадстаўлена асобная вітрына, прысвечаная гераічнай абароне Магілёва. Тут размешчаны ваенна-гістарычная карта «Абарона Магілёва», скульптурная кампазіцыя М. І. Кандрацьева «Буйніцкае поле», фотапартрэты генерал-маёра М. Ц. Раманава, палкоўніка С. Ф. Куцепава, ваеннага карэспандэнта К. М. Сіманава і яго артыкул «Гарачы дзень» у газеце «Известия».

Імя Канстанціна Сіманава — сапраўднага патрыёта, вернага сына Айчыны назаўжды ў памяці ўдзячных нашчадкаў.

Мікалай ШАЎЧЭНКА,
член Беларускага саюза журналістаў.

Сіманаўскі камень на Буйніцкім полі.

Уваход у мемарыяльны комплекс «Буйніцкае поле».

«КАЛІ Ў СУВЯЗІСТА ЎСЁ ДОБРА, ПРА ЯГО НЕ ЗГАДВАЮЦЬ»

Фота БелТА.

Праца вайскоўцаў-сувязістаў на першы погляд зусім не відовішчная. Але паспяховае выкананне баявой задачы немагчымае без добра наладжанай сувязі паміж камандаваннем і падраздзяленнямі.

На Армейскіх міжнародных гульнях, якія праходзілі некалькі месяцаў таму, беларускія ваенныя сувязісты ўдзельнічалі ў конкурсе «Упэўнены прыём». Узнагароды ў гэтай намінацыі разыгрывалі на базе Мінскага гарнізона. Для нашых вайскоўцаў конкурс прайшоў рэзультатыўна — яны атрымалі перамогу. Сапернікамі беларусаў былі прадстаўнікі Расіі, В'етнама і Таджыкістана.

Спаборніцтвы сувязістаў складаліся з пяці этапаў — «Упэўнены прыём», «Упэўненая перадача», «Радыёарыентаванне», «Работа на абсталяванні ІТ-структуры» і «Ваенізаваная эстафета». У адным з іх прымаў удзел **капітан Ілья ПРЫГАЖАЕЎ — начальнік аддзялення радыёрэлейных і трапасферных станцый.** Ён служыць у 86-й брыгадзе сувязі.

— Ад нашай каманды патрабавалася выканаць некалькі задач, — расказвае вайсковец. — Неабходна было працягнуць оптавалаконную лінію, арганізаваць па ёй службовую сувязь, зварыць пашкоджанае валакно на хуткасць, ацаніць якасць работ пры дапамозе адмысловага прыбора і арганізаваць відэаканферэнцсувязь. А на другім этапе мы мусілі настроіць спецыяльны маршрутызатар. Наш этап праходзіў адзін дзень, і на ім мы сталі найлепшымі.

Ілья Прыгажаеў кажа, што праграма конкурсаў прыкметна адрознівалася ад паўсядзённых задач і легендаў вучэнняў.

— Калі на вучэнні мы едзем для таго, каб забяспечыць сувязь паміж камандаваннем і падраздзяленнямі, то тут гэта ўжо трэба было рабіць на хуткасць. Прычым сам аб'ём работ не такі вялікі пры добрым веданні абсталявання, але ціснуў час. Мы працавалі на тэхніцы, якая зараз выкарыстоўваецца ў нашых Узброеных Сілах. Вось што было новае, дык гэта работа са зварачным апаратам. Справа ў тым, што яго выкарыстоўваем не мы, а спецыяльныя рамонтныя падраздзяленні. Таму першы трэніровачны прагон з ім аказаўся даволі марудны. Задача перад намі стаяла наступная: як мага хутчэй прыбыць на месца, дзе нітка са шкельцамі была выведзена са строю, хутка ўсё гэта зачысціць і зварыць. А ўсё астатняе складанасцяў не выклікала. Калі ў сувязіста ўсё добра, пра яго ж не згадваюць. Зрэшты, уменне варыць валакно таксама можа спатрэбіцца — хто ведае, што можа быць у жыцці.

Суразмоўнік крыху расказаў і пра іншыя конкурсы ваенных сувязістаў. Напрыклад, у намінацыі «Упэўнены прыём» трэба было злавіць адмысловым прыёмнікам сігналы, якія перадавалі расстаўленыя ў розных пунктах перадатчыкі, і запеленгаваць іх месцазнаходжанне.

— Самай відовішчнай аказалася ваенізаваная эстафета. Трэба было здзейсніць марш на камандна-штабным аўтамабілі, пасля разгарнуць і згарнуць на хуткасць радыёстанцыю. Затым экіпаж перамяшчаўся на спецыяльны этап, дзе мусіў выканаць некалькі заданняў — надзець на хуткасць агульнавайсковы засцерагальны камплект, разабраць і сабраць на хуткасць АК-74 і абціснуць вітую пару. Пасля гэтага яны адпраўляліся на стрэльбішча. Там конкурс чымсьці нагадваў біятлон — пацэліць у пяць мішэняў, за кожную незакрытую цэль даводзілася пераадолець штрафны круг. Затым трэба было пераадолець паласу перашкод. Так што сувязісты не толькі сядзяць у эфіры, як гэта можа здацца неспрактыкаванаму чалавеку.

Адзначылі найлепшых

Фота Валяр'яна ШКЛЕННІКА.

Гэтымі днямі з Узброеных Сіл звальняюцца ў запас салдаты, якія прайшлі праз тэрміновую службу. Найлепшыя з іх раней запрашаліся ў калонную залу Цэнтральнага дома афіцэраў, дзе ва ўрачыстай абстаноўцы кіраўніцтва Міністэрства абароны ўручала ім падзячныя лісты і каштоўныя падарункі. Каранавірус, аднак, унёс свае карэктывы і сюды. Праз неспрыяльную эпідэміялагічную абстаноўку масавыя мерапрыемствы давялося адмяніць. Але выйсце было знойдзена.

— Сёлета прынята рашэнне «дэцэнтралізаваць» мерапрыемства. Гэта значыць, што мы прыходзім на рабочыя месцы аднаго з бацькоў або туды, дзе працавалі юнакі да таго часу, пакуль іх не прызвалі ў армію, — расказаў **намеснік камандзіра батальёна сувязі і радыётэхнічнага забеспячэння па ідэалагічнай рабоце 50-й змешанай авіябазы Вячаслаў ВЯТОШКІН.**

Так адбылося і з радавым Антонам Васюкевічам. Ён быў прызваны ў Мачулішчы, што пад Мінскам, у лістападзе мінулага года. Атрымаў вайсковую спецыяльнасць кіроўцы-электрыка. Вячаслаў Вятошкін зазначае, што хлопец служыў добрасумленна, неаднаразова заахвочваўся камандаваннем часці за высокія вынікі ў баявой падрыхтоўцы. Удзельнічаў і ў яе грамадскім жыцці.

Прадстаўнікі авіябазы падзякавалі бацькам за выхаванне сына.

Антон скончыў БДПУ. Ведае кітайскую мову.

— За час, праведзены ў войску, я пераацаніў каштоўнасць часу, узаемаадносін. Па-іншаму пачаў разумець сэнс слоў «таварыш», «сяброўства».

Як адзначыў бацька салдата Антон Васюкевіч-старэйшы, калісьці ён таксама атрымаў гадзіннік ад міністра абароны. Чым не сямейная традыцыя?

— Самыя хвалюючыя хвіліны былі ў нас, калі сына адпраўлялі ў войска, — згадвае суразмоўнік. — Але калі мы пабачылі яго падчас прыняцця прысягі ў форме, са зброяй, як ён ішоў страявым крокам даваць клятву на адданасць Радзіме, то тут сэрца стала стукаць спакайней. Мы зразумелі, што ён пераадолеў псіхалагічны бар'ер і стаў членам адной вялікай вайсковай сям'і.

СТАНОЎЧЫЯ ВЫНІКІ І ЗАДАЧЫ НА ЗАЎТРА

30 лістапада ва Узброеных Сілах завяршаецца чарговы навучальны год. У Генеральным штабе падвялі вынікі падрыхтоўкі арміі за апошнія 12 месяцаў і акрэслілі задачы на будучыню. Аб гэтым паведамілі ў Міністэрстве абароны.

«У навучальным годзе даказала сваю эфектыўнасць створаная сістэма падтрымання баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці Узброеных Сіл. Пра гэта сведчаць станоўчыя вынікі мноства праведзеных праверак, у тым ліку і раптоўных», — заявіў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.**

Ён таксама адзначыў эфектыўную работу органаў ваеннага кіравання па будаўніцтве і развіцці Узброеных Сіл. План мерапрыемстваў на наступныя пяць гадоў ужо распрацаваны. Але ўжо зараз, зыходзячы з задачы аптымізацыі баявога складу і колькасці войскаў, павялічылася колькасць сіл недакладнага рэагавання. Былі таксама аптымізаваны тэрміны гатоўнасці дзяжурных сіл па проціпаветранай абароне, выраслі магчымасці Узброеных Сіл па дзеяннях у розных крызісных сітуацыях.

— На працягу года было эфектыўна праведзена больш за 80 мерапрыемстваў аператыўнай падрыхтоўкі. Высока ацэнены вынікі сумеснага беларуска-расійскага аператыўна-тактычнага вучэння «Славянскае братэрства — 2020», вучэнні з міратворчымі сіламі АДКБ «Непарушнае братэрства — 2020». Паказчыкам аптымальных падыходаў да баявой падрыхтоўкі стаў высокі ўзровень палявой вывучкі нашых вайскоўцаў, прадэманстраваны ў ходзе ўдзелу ў стратэгічным камандна-штабным вучэнні Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі «Каўказ-2020», — адзначылі ў ваенным ведамстве.

У цэлым дзейнасць Генеральнага штаба Узброеных Сіл і штабоў усіх узроўняў ацэненая як «рэзультатыўная».

Акрамя таго, былі пастаўленыя задачы і ўдакладнены кірункі дзейнасці на наступны навучальны год.

— Прыярытэтам па-ранейшаму застанецца падтрыманне баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці ўсіх воінскіх фарміраванняў. Будзе завершана планаванне на сяроднетэрміновую перспектыву будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл у цэлым і іх функцыянальных сістэм. Працягнецца іх аснашчэнне новымі і мадэрнізаванымі ўзорамі ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі. А органам ваеннага кіравання трэба будзе засяродзіць намаганні на падрыхтоўцы і правядзенні сумеснага з Узброенымі Сіламі Расійскай Федэрацыі стратэгічнага вучэння «Захад-2021» на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, — адзначылі ў Міністэрстве абароны.

АРМІЯ НА РАДЫЁХВАЛЯХ

Ваеннае інфармацыйнае агенцтва «Ваяр» пачало вяшчанне інтэрнэт-радыё «Компас FM».

У аснову творчай канцэпцыі радыёстанцыі ляглі перадачы музычнага, інфармацыйнага і забаўляльнага характару. Радыё арыентавана пераважна на мужчын і жанчын ва ўзросце 35—55 гадоў, для якіх важныя патрыятызм, сям'я, сябры і блізкія, стабільная і ўпэўненая будучыня суверэннай Беларусі.

Мяркуецца, што налета «Компас FM» пачне вяшчанне і ў FM-дыяпазоне.

Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Авто от Мастеркард. Декабрь»

1. Организатор Рекламной игры

Закрытое акционерное общество «Сэлмон-Графикс» (далее – Организатор), УНП 100843219, адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 39, офис 603.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Заинтересованное лицо).

2. Наименование и территория проведения Рекламной игры

Рекламная игра носит название «Авто от Мастеркард. Декабрь» (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»), находящихся в Республике Беларусь.

3. Срок начала и окончания Игры

Игра проводится с 01 декабря 2020 г. по 05 февраля 2021 г. (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

4. Комиссия по проведению Игры

Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Игры (далее – Комиссия) в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.

Состав Комиссии:

1. Лукашевич Ольга Леонидовна – индивидуальный предприниматель – управляющий ЗАО «Сэлмон-Графикс» – председатель комиссии;

2. Стельмах Александр Петрович – заместитель директора по правовым вопросам ООО «Медиа Крама»;

3. Василькова Елена Александровна – ведущий специалист отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

4. Садовская Диана Сергеевна – специалист отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

5. Расько Екатерина Александровна – экономист по договорной работе ООО « Сэлмон Медиа».

5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра

Игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard (далее – Карта Mastercard), за исключением карт Maestro и Белкарт/ Maestro, для оплаты топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть».

6. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Игры

6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, являющиеся держателями действующей банковской карты Mastercard, за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro с учетом ограничений, указанных в данных правилах (далее – Участник Игры).

6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены Комиссии.

6.3. Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:

в период с 01 декабря 2020 г. по 31 декабря 2020 г. включительно совершить покупку топлива по собственной Карте Mastercard, за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, на АЗС сети ПО «Белоруснефть» на сумму не менее 1 (одного) белорусского рубля одним чеком с использованием собственной зарегистрированной накопительной информационно-учетной карты (в дальнейшем – Карта «Заправка»), которая определяет физическое лицо как участника программы поощрения клиентов (физических лиц) ПО «Белоруснефть» (далее – Программа «Заправка»), проводимой на АЗС сети «Белоруснефть».

Зарегистрированной считается Карта «Заправка» при указании ее владельцем в анкете регистрации следующих достоверных данных: фамилии, имени, отчества (при наличии), даты рождения, номера мобильного телефона операторов сотовой связи в международном формате, населенного пункта, а также адреса электронной почты.

6.4. Участник Игры может участвовать в Игре только один раз независимо от количества и сумм совершенных покупок.

7. Состав и размер призового фонда и источники его формирования

Размер призового фонда игры составляет **34 346,90** (тридцать четыре тысячи триста сорок шесть) белорусских рублей 90 копеек. Состав призового фонда:

Наименование	Количество, шт.	Стоимость за единицу, бел. руб.	Общая стоимость, бел. руб.
Автомобиль: Skoda Rapid Active 1.6 MPI Год выпуска: 2020 Цвет кузова: Белый Номер кузова: XW8AG2NH4MK103463	1	**29 900,00**	**34 346,90**
И денежные средства для уплаты налога в размере **4 446,90** белорусского рубля	1	**4 446,90**	

Источником формирования призового фонда Игры являются денежные средства Заинтересованного лица – ООО «Рефорте».

8. Проведение розыгрыша призового фонда

8.1. Место, дата и время проведения розыгрыша

Розыгрыш призового фонда проводится открыто в присутствии Комиссии по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 143 (АЗС № 23 РУП «Белоруснефть-Минскавтозаправка»).

Дата и время проведения розыгрыша: 12 января 2021 г. в 18.30.

8.2. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения победителей:

8.2.1. Для розыгрыша в установленном порядке формируется список участников (далее – Список) с указанием даты первой транзакции, соответствующей условиям Рекламной игры, присвоенного номера Шанса, номера Карты «Заправка», фамилии, имени, отчества (при наличии) участника, даты рождения, электронного адреса, телефона и населенного пункта.

Каждому Участнику Игры, выполнившему условия, указанные в подпункте 6.3. данных правил, присваивается номер Шанса по номеру Карты «Заправка» в порядке возрастания. Все номера Шансов имеют одинаковую разрядность.

8.2.2. Для проведения розыгрыша используются специальный вращающийся непрозрачный барабан и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 по 9.

Определение выигрышного номера Шанса происходит путем его формирования поразрядно слева направо из номеров шаров, последовательно извлекаемых из барабана.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера Шанса в барабан помещаются шары с номерами от «0» до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего порядкового номера Шанса из Списка. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера Шанса.

Далее для определения цифры в следующем разряде формируемого выигрышного номера Шанса в барабан загружаются шары с номерами, которые существуют в соответствующем разряде номеров Шансов в Списке. Шары перемешиваются, и из барабана извлекается один шар. Номер шара вносится в протокол и записывается в соответствующий разряд формируемого выигрышного номера Шанса.

Определение 2 (двух) альтернативных выигрышных номеров Шансов (Альтернативного победителя № 1 и Альтернативного победителя № 2) происходит следующим образом: Альтернативным победителем № 1 становится Участник Игры с номером Шанса через 6000 номеров от победившего номера Шанса, Альтернативным победителем № 2 становится Участник Игры с номером Шанса через 12 000 номеров от победившего номера Шанса.

В случае если выпавший номер Шанса находится в конце Списка, то исчисление для определения Альтернативных победителей продолжается с начала Списка.

8.2.3. При проведении розыгрыша Комиссией оформляется протокол розыгрыша.

8.2.4. Участники Игры вправе присутствовать при проведении розыгрыша.

9. Срок и способ информирования победителя, место, порядок и срок выдачи выигрыша

9.1. После проведения розыгрыша Организатор уведомляет победителя о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 14 января 2021 г. включительно.

9.2. Для получения приза победителю необходимо в срок не позднее 18 января 2021 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by следующие данные:

9.2.1. для граждан Республики Беларусь, а также иностранных граждан и лиц без гражданства, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь:

- копию страницы 25, страниц 31–33 паспорта – для граждан Республики Беларусь;

- копию страницы 3, страниц 15–17 вида на жительство – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь;

9.2.2. для иностранных граждан и лиц без гражданства, не имеющих вида на жительство:

- копию паспорта страны, гражданином которой он является (для лиц без гражданства – документ, подтверждающий их личность, выданный в порядке законодательства страны фактического проживания). В случае если данный документ выдан не на государственном языке Республики Беларусь, также заверенный нотариально перевод такого документа на государственный язык Республики Беларусь.

9.3. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, Минск, ул. Шаранговича, 65 в срок не позднее 22 января 2021 г. включительно. Победитель предварительно согласовывает дату и время прибытия за получением приза с Организатором по телефону +375 17 318-98-00.

9.4. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с победителем любым из указанных выше способов, либо победитель не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Заправка», либо победитель отказывается от приза, либо победитель не явился за получением приза, либо принято решение об отказе в выдаче приза Победителю в связи с нарушением правил Игры, право на приз переходит Альтернативному победителю № 1.

9.5. Альтернативный победитель № 1 уведомляется о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 25 января 2021 г. включительно. Для получения приза Альтернативный победитель, которому перешло право на получение приза, должен не позднее 27 января 2021 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by данные, указанные в п. 9.2. правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Шаранговича, 65 в срок не позднее 29 января 2021 г. включительно.

9.6. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с Альтернативным победителем № 1 любым из указанных выше способов, либо Альтернативный победитель № 1 не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Заправка», либо Альтернативный победитель № 1 отказывается от приза, либо Альтернативный победитель № 1 не явился за получением приза, либо принято решение об отказе в выдаче приза Альтернативному победителю № 1 в связи с нарушением правил Игры, право на приз переходит Альтернативному победителю № 2.

9.7. Альтернативный победитель № 2 уведомляется о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 01 февраля 2021 г. включительно. Для получения приза Альтернативный победитель № 2, которому перешло право на получение приза, должен не позднее 03 февраля 2021 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by данные, указанные в п. 9.2. правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Шаранговича, 65 в срок не позднее 05 февраля 2021 г. включительно.

9.8. Альтернативный победитель № 2 утрачивает право на получение приза, если с ним не удается связаться любым из указанных выше способов, либо Альтернативный победитель № 2 не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Заправка», либо Альтернативный победитель № 2 отказывается от приза, либо Альтернативный победитель № 2 не явился за получением приза, либо принято решение об отказе в выдаче ему приза в связи с нарушением правил Игры.

9.9. В случае если победитель (Альтернативный победитель № 1 или № 2) не может приехать за получением приза лично, приз может получить его доверенное лицо по предъявлении копии паспорта либо вида на жительство победителя (Альтернативный победитель № 1 или № 2), своего паспорта либо вида на жительство и нотариально заверенной либо приравненной к таковой доверенности от победителя (Альтернативного победителя № 1 или № 2).

9.10. С момента передачи приза к победителю (соответственно Альтернативному победителю № 1 или № 2) переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением призом. Денежная компенсация стоимости призов не производится. Победитель, (соответственно – Альтернативный победитель № 1 или № 2) (в случае их нежелания получить приз) не вправе передать право на получение приза другому лицу. Приз не подлежит замене.

9.11. В соответствии с законодательством Республики Беларусь при выдаче призов Организатор удерживает и перечисляет в бюджет подоходный налог в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, из суммы денежных средств соответствующего приза. Вручение призов осуществляется за минусом удержанной суммы подоходного налога из денежной части приза.

9.12. Организатор не оплачивает победителю (соответственно Альтернативному победителю № 1 или № 2) расходы, связанные с проездом к месту получения приза.

10. Порядок информирования об условиях и результатах Игры

10.1. Факт участия в Игре означает, что Участники Игры соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фото-, аудио-, видео- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором и Заинтересованным лицом в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору, Заинтересованному лицу.

10.2. Участник Игры, претендующий на получение приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Игры для получения приза.

10.3. Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников Игры с настоящими Правилами.

10.4. Правила проведения Игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Игры в газете «Звязда». Информация о результатах розыгрыша публикуется не позднее 03 февраля 2021г. включительно в газете «Звязда».

10.5. Телефон для справок по вопросам проведения Игры (МТС – 033, А1 – 029, Life – 025) 6 431 431 круглосуточно без выходных.

Свидетельство № 3891 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 20 ноября 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Авто от Мастеркард. Октябрь»

Организатор рекламной игры: ЗАО «Сэлмон-Графикс», юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 39, офис 603, УНП 100843219, зарегистрировано решением Минского горисполкома от 2 декабря 2008 г.

Рекламная игра называется «Авто от Мастеркард. Октябрь».

Срок проведения рекламной игры: в период с 01 октября 2020 года по 04 декабря 2020 года (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

Территория проведения рекламной игры: автозаправочные станции предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в состав Государственного производственного объединения «Белоруснефть», находящихся в Республике Беларусь.

Свидетельство № 3855 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 10 сентября 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

В рекламной игре приняло участие 155 952 физических лица.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победитель рекламной игры «Авто от Мастеркард. Октябрь»

Главный приз № 1 – Автомобиль: KIA RIO_FB, № кузова Z94C251AALR110178 и денежные средства для уплаты налога в размере 4 518,62 (четыре тысячи пятьсот восемнадцать) белорусских рублей 62 копейки

№ п/п	№ Шанса	Номер карты	ФИО победителя	Населенный пункт
1	093 571	2000015134576	Довнар Николай Владимирович	Минск

Телефон горячей линии по вопросам проведения рекламной игры (МТС – 033, А1 – 029, Life – 025) 6 431 431, круглосуточно.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ОХОТНИЧЬИХ УГОДИЙ ФОНДА ЗАПАСА

Добрушский районный исполнительный комитет 29 декабря 2020 г. в 10.00

по адресу: Гомельская обл., г. Добруш, ул. Князя Паскевича, 9, зал для совещаний

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ КОНКУРС

на право заключения договора аренды охотничьих угодий фонда запаса в Добрушском районе сроком на 20 лет общей площадью 2,8 тыс. га,

в том числе: 0,5 тыс. га – лесных, 2,0 тыс. га – полевых, 0,3 тыс. га – водно-болотных,

в соответствии с Положением о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий, определения размеров платы за право заключения договора аренды и арендной платы за охотничьи угодья, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь 14 июня 2018 г. № 454, расположенных:

северная: от юго-западного угла квартала № 583 Ветковского лесничества Ветковского спецлесхоза в восточном направлении по южным границам кварталов №№ 583, 584 указанного лесничества до юго-восточного угла квартала №№ 584, далее в юго-восточном направлении по лесным землям до юго-западного угла квартала № 319 Шабринского лесничества Гомельского опытного лесхоза, далее в юго-восточном направлении по южным границам кварталов № 321, 322 указанного лесничества, в северо-восточном направлении по юго-восточной границе квартала № 322, в юго-восточном направлении по южной границе квартала № 1 до его юго-восточного угла;

восточная: от юго-восточного угла квартала № 1 Шабринского лесничества Гомельского опытного лесхоза в южном направлении по западным границам кварталов №№ 10, 16, 62, 63 до юго-западного угла квартала № 63 указанного лесничества;

южная: от юго-западного угла квартала № 63 Шабринского лесничества Гомельского опытного лесхоза в северо-западном и юго-западном направлениях по северным границам кварталов №№ 64, 61, 58, 57, в северо-западном направлении по западной границе квартала № 52, в северо-восточном направлении по южной границе квартала № 46, в юго-восточном направлении по южным границам кварталов №№ 13, 14, в северном направлении по восточной границе квартала № 14, в западном и юго-западном направлениях по северным границам кварталов №№ 14, 13, 46, 45, 44, 43, 42, 47, в юго-восточном направлении по юго-западной границе квартала № 47, в юго-западном направлении по северной границе квартала № 488 до юго-восточного угла квартала № 118 Шабринского лесничества Гомельского опытного лесхоза;

западная: от юго-восточного угла квартала № 118 Шабринского лесничества Гомельского опытного лесхоза в северном направлении по восточным границам кварталов №№ 118, 117, 112, 110, 102, 97 Шабринского лесничества Гомельского опытного лесхоза и квартала № 588 Ветковского лесничества Ветковского спецлесхоза до юго-западного угла квартала № 583 Ветковского лесничества Ветковского спецлесхоза.

Запретные для охоты зоны на территории охотничьих угодий устраиваемого объекта не выделены.

Договор аренды охотничьих угодий должен быть подписан в срок не позднее 5 рабочих дней с даты объявления победителя конкурса.

Сумма ежегодной арендной платы за охотничьи угодья составляет 0,28 базовой величины (7,56 белорусского рубля).

Условия проводимых торгов:

опыт ведения охотничьего хозяйства и охоты;

наличие обученных специалистов в области охотничьего хозяйства;

наличие технических средств.

Участник торгов до момента подачи конкурсного предложения вносит задаток в размере 20 процентов суммы арендной платы за охотничьи угодья, что составляет 1,51 рубля, путем перечисления на расчетный счет Добрушского районного исполнительного комитета BY32AKBB36424000090693000000, БИК AKBBBY2X, УНП 400006257, ОКПО 04063380, ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, назначение платежа – арендная плата (задаток) за охотничьи угодья.

Возмещение затрат на организацию и проведение торгов, расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам торгов документации, осуществляется победителем торгов в трехдневный срок с даты подписания договора аренды в районный бюджет: на расчетный счет Главного управления Министерства финансов РБ по Гомельской области BY84AKBB36004150000170000000, г. Минск, ОАО АСБ «Беларусбанк», УНП 400555165, БИК AKBBBY2X, назначение платежа 04616.

Размер возмещения составляет:

- 1200,00 белорусских рублей за разработку и согласование биолого-экономического обоснования;

- дополнительно – сумму оплаты за публикации в средствах массовой информации извещения о проводимых торгах.

К участию в конкурсе допускаются юридические лица, предоставившие в Добрушский райисполком следующие документы:

заявление об участии в торгах и предоставлении охотничьих угодий в аренду;

копию документа, подтверждающего полномочия руководителя участника торгов либо доверенность представителя участника торгов и копию документа, подтверждающего его личность, в случае если заявление подписывается не руководителем участника торгов;

копию платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка;

предложения в письменной форме о выполнении условий торгов, запечатанные в отдельном конверте, при проведении торгов в форме конкурса. При этом данные предложения являются окончательными и не могут уточняться в ходе торгов.

Документы принимаются по адресу: Гомельская обл., г. Добруш, ул. Князя Паскевича, 9, каб. 23, управление сельского хозяйства и продовольствия Добрушского райисполкома, по рабочим дням с 8.30 до 17.30 **по 28 декабря 2020 включительно,** тел. секретаря комиссии 8 02333 5 98 31.

Комиссия по организации и проведению открытых торгов по предоставлении в аренду охотничьих угодий фонда запаса Добрушского района.

Настаўнік года Вадзім ЛОСЕЎ:

«СА ШКОЛЫ ПАВІННЫ ВЫХОДЗІЦЬ ШЧАСЛІВЫЯ ЛЮДЗІ»

«Я хацеў бы, каб у гэтай зале і ў гэтым свеце ніхто і ніколі не ставіў пад сумненне ўпэўненасць у сабе. Не давайце нікому карміць вашага ўнутранага дыверсанта! Заўсёды будзьце ў гармоніі з сабой, любіце і прымайце сябе...», — параіў калегам у сваім публічным выступленні ў суперфінале Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў настаўнік геаграфіі з гомельскай сярэдняй школы № 19 Вадзім ЛОСЕЎ. Рашэннем прадстаўнічага журы менавіта ён стаў пераможнікам і ўладальнікам звання «Настаўнік года — 2020». У праграме «Размовы пра адукацыю» Вадзім Лосеў расказаў пра тое, як серыялы дапамагаюць яму прадухіліць прафесійнае выгаранне, чаму не варта спадзявацца толькі на Google і што можа здарыцца, калі танцор пойдзе ў гісторыкі...

«МЫСЛЕННЕ МІКРАХВАЛЁЎКІ»

— У дзяцінстве я марыў быць кіроўцам аўтобуса. Спадзяюся, мне не давядзецца рэалізоўваць у жыцці гэту сваю дзіцячую мару, бо кіраваць я так і не навучыўся, — усміхаецца педагог. — Правы ў мяне ёсць, але сядзець за рулём — не маё. І калі я на фізічным узроўні гэта адчуваю, то лепш і не буду займацца. А вось у педагогіцы цалкам раствараюся. Тут я на сваім месцы. Мая маці — настаўніца пачатковых класаў. І я з дзяцінства бачыў, наколькі гэта цяжкая праца — яна заўсёды прыносіла работу дадому. Прызнаюся, што, стаўшы настаўнікам, ніколі са школы работу не прыношу. Гэта мая прынцыповая пазіцыя: лепш я затрымаюся на рабоце на некалькі лішніх гадзін. І дома мы ніколі не размаўляем аб рабочых момантах, не абмяркоўваем іх — там мы дзелімся сваімі эмоцыямі.

Я лічу, што навучыць чалавека можна ўсяму — і нейрахірургіі, і кіраванню аўтобусам, але элемент творчасці ў кожнага індывідуальны і ўнікальны. Мая прафесія на 50 працэнтаў складаецца з майстэрства і яшчэ на 50 працэнтаў — з творчасці. І, як у кожнай прафесіі, можна быць рамеснікам, а можна быць майстрам. Творчы падыход — гэта вельмі важны складнік.

У аснове маёй ідэі, прадстаўленай на конкурсе «Настаўнік года», ляжала натхнёнасць інтэлектуальнай гульнёй. Я зразумеў, што гэта вельмі ўдалы інструмент для развіцця на ўроках крытычнага мыслення, крэатыўнасці, кааперацыі і камунікацыі ў вучняў — ключавых кампетэнцый XXI стагоддзя. Тут у нас і пытанні на логіку, і медыяазбука, і бліц-тур... Я не ўкраў ідэю, а натхніўся ёй. Вялікая колькасць IT-кампаній і прыватных ініцыятыў прад'яўляе да кандыдатаў патрабаванне: уменне працаваць у камандзе. Усе памылкова думаюць, што ўмеюць гэта рабіць, але правальваюць першае ж выпрабаванне, таму што ўсё жыццё да гэтага мы займаліся выкананнем тэстаў, самастойных работ, у тым ліку курсавых і дыпломных. А я прапаную прыйсці да высновы сумеснымі намаганнямі. Індывідуальнасць павінна раскрывацца ў камандзе.

Работадаўцы кажуць: «Рызыкуйце! Шукайце! Узаемадзейнічайце!», але ці многія, хто прайшоў праз нашу сістэму адукацыі, на гэта здольныя? Інфармацыі цяпер вакол нас вялікая колькасць, але ёй трэба ўмець карыстацца. Я кажу дзецям: «Магу даць вам 15 мабільных тэлефонаў з доступам у інтэрнэт, але ад таго нічога не зменіцца. Бо трэба ўмець працаваць з інфармацыяй, карыстацца сваёй галавой і рабіць гэта ў камунікацыі з іншымі». Я вельмі ліберальны чалавек, але гаджэты разбэшчваюць: калі дзеці проста ўпіраюцца ў Google — гэта не работа. Акрамя таго, што можна «нагугліць», патрабуюцца яшчэ і надпрадметныя веды і навыкі. Спадзеючыся толькі на Google, ты атрымліваеш «мысленне мікрахвалёўкі». Між іншым, многія думаюць, што калі яны не могуць нешта «нагугліць» за тры секунды, то знайсці гэта ўвогуле немагчыма.

Вадзім Лосеў расказаў, што падчас свайго майстар-класа, які ён праводзіў у БДПУ ў рамках конкурсных выпрабаванняў, дэманстраваў студэнтам магчымасці выкарыстання Instagram для навучання. «Аказваецца, там можна глядзець не толькі на ежу, — жартуе настаўнік. — Я паказаў ім усе «алоўкі», што ёсць у гэтай «скрынцы», магчымасці дадзенай сацыяльнай сеткі. Вучням не вельмі падабаецца работа з контурнымі картамі, тады я ім кажу: «А ці ведаеце вы, колькі каштуюць расфарбоўкі для дарослых? А цяпер адкрываем разам контурныя карты і пачынаем займацца групавой псіхатэрапіяй...»

У РЭЖЫМЕ ШМАТЗАДАЧНАСЦІ

— Ад настаўнікаў сёння патрабуюць, каб яны былі добрымі менеджарамі, умелі збіраць грошы на шторы, клалі лінолеум. Я кажу як ёсць. І лінолеум у класе я разам са сваім бацькам клаў, і фарбаваннем мы з ім займаліся, але пры гэтым ты яшчэ павінен і план-канспект урока напісаць, і ў конкурсе паўдзельнічаць, і дзяцей да алімпіяды падрыхтаваць, і вывезці іх на прафарыентацыйную экскурсію, — разважае Вадзім Лосеў. — Я мяркую, для таго каб не дапусціць прафесійнага выгарання, кожны настаўнік павінен зразумець, што ў яго атрымліваецца найлепшым чынам. Ёсць педагогі, якія проста ідэальна запаўняюць паперкі. У іх усё раскладзена па палічках, яны хутка ўзнімаюцца па кар'ернай лесвіцы, займаюць кіруючыя пасады, таму што ў іх ёсць здольнасць да добрай арганізацыі такой работы і любоў да бюракратызму.

У сваёй трылогіі «Мурашы» Бернар Вербер праводзіць аналогіі з чалавечым светам і сцвярджае, што 33 працэнты ўсіх людзей — гэта гультаі, 33 працэнты — працаголікі і яшчэ 33 працэнты — тыя, хто думаюць, што можна папрацаваць, а можна і адпачыць. Дык вось шчыра прызнаюся, што я працую ў энергазберагальным рэжыме. Для мяне важна нечым загарэцца, каб устаць і пайсці гэта рабіць, і для мяне важна да сябе прыслухоўвацца.

А хочаце, я скажу, хто пераможа на наступным конкурсе «Настаўнік года»? Чалавек з добра развітым эмацыянальным інтэлектам, магчыма, гэта будзе настаўнік фізічнай культуры. Таму што ўменне дзяліцца эмоцыямі, прымаць і любіць сябе для педагога вельмі важнае. Калі ты сам сябе не палюбіш, цябе не палюбіць ніхто. Настаўнік павінен адсочваць свае эмоцыі: мне сумна, мне весела, мне радасна, я супакойваюся, я нервуюся... Глядзіце, дзе ў вас самы вялікі плюс. Не трэба выходзіць з зоны камфорту — трэба хоць бы паспрабаваць у яе ўвайсці. Многія хапаюцца за ўсё адразу і вельмі хутка эмацыянальна выгараюць, таму што не ўсё ў іх атрымліваецца. У геаграфіі ёсць і геалогія, і тапаграфія, і кліматалогія, і краіназнаўства. Напрыклад, метэаралогія і кліматалогія не адгукаюцца ў маім сэрцы, а вось краіназнаўства мне вельмі цікавае, і вучні гэта адчуваюць. Я магу натхняць дзяцей, і сам пры гэтым натхняюся. Не магу пахваліцца падрыхтоўкай да алімпіяд, але да ЦТ рыхтую вельмі добра. Дык добры я педагог ці не? А ад настаўніка патрабуюць быць паспяховымі ва ўсім! Але ж ці гэта магчыма?

Асабліва пасля конкурсу «Настаўнік года» адчуваю, што абсалютна знясілены. Многія мае калегі ўвогуле захварэлі пасля моцнага фізічнага і псіхалагічнага напружання. Ведаеце анекдот? «— Як вы расслабляецеся? — Дык я і не напружваюся». А вось я напружваюся і прытым вельмі моцна. Таму, каб адпачыць, гляджу лёгкія ўкраінскія серыялы і самыя прымітыўныя раэаліці-шоу. Не смейцеся, але гэта мой спосаб атрымаць разрадку і прадухіліць выгаранне. Я толькі ў 30 гадоў прыйшоў да таго, што трэба даваць сабе магчымасць адпачыць, бо мы раслі і выхоўваліся сярод іншых установак.

А адміністрацыя і грамадства патрабуюць ад настаўніка ўсё! І многія педагогі «выходзяць у тыраж», не спраўляюцца з вар'яцкай нагрузкай. Ці ўсе могуць працаваць у рэжыме мультызадачнасці? Мне здаецца, што гэта пад сілу толькі настаўнікам ну і, магчыма,

Падчас міні-ўрока ў суперфінале конкурсу «Настаўнік года» ўсе «вучні» адправіліся з Вадзімам ЛОСЕВЫМ у віртуальнае падарожжа па суседніх краінах.

медыкам. Мы вырашаем за тыдзень тысячу задач адначасова...

ЧАМУ ДАРОСЛЫЯ — ЗАНУДНЫЯ?

На думку Вадзіма Лосева, настаўнікі сёння арыентаваныя на сярэдняга вучня.

— Слабага мы крыху ўзнімаем, а моцнага, наадварот, крыху апускаем. І не трэба казаць пра нейкі індывідуальны падыход і дыферэнцыраваныя заданні. Я пачуў ад аднаго паважанага прафесара цікавую думку: ён лічыў, што развал школы пачаўся ў 1974 годзе, калі непаспяховых вучняў забаранілі выключаць са школы. Зараз у нас няма ніякіх рычагоў уздзеяння на нашых навучэнцаў і размова ідзе толькі пра матывацыю, — падкрэслівае педагог. — Калі нам, дарослым, не падабаецца наша работа, то мы ўзважваем усе плюсы і мінусы і застаёмся або змяняем месца работы ці нават род нашых заняткаў. А ў дзіцяці адны толькі мінусы ад вучобы, свабоднага часу ўвогуле няма, але са школы пайсці ў свабоднае плаванне яно не можа. Мы не гаворым, што вучань неразумны, а гаворым, што ён слабаматываваны, што яму патрэбны індывідуальны падыход і стымулюючыя заняткі. Але гэта ўсё не працуе! Калі дзіця не хоча браць веды, то яно і не возьме іх. Вы можаце стаяць перад ім на галаве, жангліраваць шарамі. Але калі з яго боку гэта катэгарычнае «не», усё бессэнсоўна.

Калі шчыра, я баюся думкі, што інтэлект мае генетычную спадчыннасць. Таму што калі гэта так, то страчваецца ўся сутнасць адукацыі. Хацеў бы, каб са школы выходзілі перш за ўсё шчаслівыя людзі. У дзіцяці не ляжыць душа да матэматыкі і фізікі, але бацькі кажуць сыну ці дачцэ, што трэба займацца праграмаваннем. І ніякія аргументы кшталту «я там буду вельмі сярэднім спецыялістам» на іх не ўздзейнічаюць. А, можа, маё — гэта танцы? Я ведаю выпадак, калі бацькі літаральна прымусілі ісці на гістарычны факультэт чалавека, які выдатна танцаваў, і праблемы са здароўем як рэакцыя арганізма на тое, што чалавек пайшоў супраць сваёй прыроды, не прымусілі сябе чакаць.

Скажыце, вы не задумваліся, чаму ў масе сваёй з яркіх, творчых і крэатыўных дзяцей вырастаюць такія занудныя дарослыя? Можа, таму, што мы вельмі часта выбіраем не свой шлях? Калі вы ўбачыце дарослага, які не нудзіцца, спытайце, ці ціснулі на яго бацькі, калі той выбіраў сваю будучыню? Занудны дарослы — гэта колішняе дзіця, якое знаходзілася пад ціскам настаўнікаў і бацькоў, гэта чалавек, які не ўмее спраўляцца з няўдачамі. Прызнаюся, што падчас удзелу ў конкурсе з павышэннем маёй самаацэнкі мне вельмі дапамог псіхолаг. У школе яна была заніжаная. Ва ўніверсітэце — на нармальным узроўні, але дзякуючы таму, што спецыяліст папрацаваў са мной, я паверыў у сябе і пачаў часцей сябе хваліць. У чым заключаецца феномен Вольгі Бузавай? Спачатку з цябе ўсе смяюцца, а потым ты смяешся з усіх, бо становішся адной з самых заможных жанчын у Расіі. Гэта ж наколькі трэба быць упэўненай у сабе, не маючы таленту! Хачу, каб мае вучні былі ўпэўненымі людзьмі, прыслухоўваліся да сябе, знаходзілі ў сабе адказы і ішлі па жыцці сваёй дарогай.

Сёння быць блогерам — такая ж работа, як і іншыя. Не здзіўлюся, калі ў хуткім часе з'явіцца эксперт па мемах, які будзе працаваць над клікабельнасцю. Нельга казаць дзіцяці, што ты марыш не пра тое, што твая мара няправільная. У нас быў праект — трэба было асвятліць нейкую экалагічную праблему. Усе падышлі да яго творча. Адзін вучань арганізаваў канал на YouTube, адкрыў новую нішу — смешныя экалагічныя навіны. А чаму б і не? Можа быць, дзякуючы геаграфіі ён знойдзе сябе ў нейкай новай сферы, пра якую мы яшчэ не ведаем?..

НАВЫКІ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

У Вадзіма Лосева спыталіся, а што б ён змяніў, калі б стаў міністрам адукацыі?

— Пасля заканчэння дзявятага класа я ўвёў бы глабальны тэст, каб праверыць праграму за базавую школу па ўсіх прадметах, — адказаў ён. — І калі ты набіраеш, напрыклад, 51 бал і больш, можаш ісці ў старшую школу, а калі менш, — то, калі ласка, выбірай любую ўстанову прафесійнай адукацыі. А пасля 11 класа аб'яднаў бы выпускныя і ўступныя іспыты. У нас пры падачы дакументаў у навучальныя ўстановы ўлічваецца сярэдні бал атэстата. Мяркую, што трэба мець на ўвазе ўсе балы, пачынаючы, напрыклад, з восьмага ці, можа, нават з шостага класа. А так атрымліваецца, што вучань напружваецца толькі ў апошні год свайго навучання, працуючы на сярэдні бал.

Таксама я зрабіў бы пяць вучэбных чвэрцяў: каб кожная доўжылася сем тыдняў, а паміж імі — двухтыднёвыя канікулы. Больш адпачынку, але і больш работы. Канешне, давядзецца забраць пад вучобу яшчэ і чэрвень. Але, пагадзіцеся, што настаўнікі ўсё роўна ў чэрвені працуюць, а дзецям пасля працяглых трохмесячных летніх канікул вельмі праблематычна зноў уцягвацца ў рабочы рытм. Да таго ж за два тыдні канікул паміж вучэбнымі чвэрцямі можна паспець адпачыць і вучням, і настаўнікам. У апошніх, верагодна, нават з'явіцца час для прафесійнага росту... Тым больш што выводзіць гадавую адзнаку па выніках пяці чвэрцяў прасцей, чым па чатырох.

Разважаючы пра тое, якой ён бачыць сістэму адукацыі, напрыклад, праз пяць гадоў, Вадзім Лосеў сказаў наступнае: «Думаю, што калі б у нас прыбралі пэўныя структуры ў адукацыі, то іх знікнення ніхто б і не заўважыў. А вось калі з піраміды прыбраць настаўніка, то абваліцца ўсё. Мяркую, што будзе павялічвацца колькасць прыватных школ і ініцыятыў, куды дзеці будуць прыходзіць з канкрэтным запытам, напрыклад, «хачу ведаць матэматыку». У звычайных школах, як правіла, не вучні фармулююць мэты, іх перад дзецьмі ставім мы. Я ўвогуле баюся гэта казаць услых, але нашы школы ператвараюцца ў камеры захоўвання, куды бацькі прыводзяць сваіх дзяцей, каб педагогі з імі займаліся, пакуль тыя працуюць. Мала хто можа сфармуляваць адукацыйны запыт. Спадзяюся, што калі-небудзь у школе пачнуць даваць дзецям практычныя навыкі, неабходныя для жыцця, што туды прыйдуць, напрыклад, прадстаўнікі водаканала ці энерганагляду і навучаць, як здымаць паказчыкі з прыбораў уліку і ўводзіць іх у сістэму АРІП. Асабіста для мяне гэта складаная навука (*смяецца*), а ролікаў на YouTube, як гэта рабіць, няма. А можа, і ўменне адкрываць вустрыцы каму-небудзь спатрэбіцца ў жыцці? На першы план сёння выходзяць не акадэмічныя веды, а так званыя мяккія, або сацыяльныя навыкі (soft skills): крытычнае мысленне, крэатыўнасць, уменне працаваць у камандзе, гнуткасць, уменне папярэджваць і гасіць канфлікты, гатоўнасць браць на сябе адказнасць, самаарганізацыя, уменне аргументавана дыскутаваць, фармуляваць мэты і ставіць задачы, гатоўнасць вучыцца ўсё жыццё, таму што прафесійныя навыкі давядзецца абнаўляць пастаянна».

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Калі б не сям'я Абрамукоў, наш род перастаў бы існаваць яшчэ ў 1941 годзе»

Расіянка з Ніжняга Ноўгарада знайшла ў беларускай вёсцы сваякоў і аднавяскоўцаў людзей, якія ў час вайны ратавалі сям'ю яе бабулі, жонкі афіцэра Чырвонай Арміі

У Агародніцкі сельскі Савет Камянецкага раёна, што на Брэстчыне, прыйшло пісьмо з Ніжняга Ноўгарада ад Марыны Гуранды. Вось яго сціслы пераказ: «Мой дзед Папоў Рыгор Іванавіч служыў у 1940 годзе ў складзе 15-га стралковага палка 49-й дывізіі на заставе прыкладна за сорак кіламетраў ад Брэста. Яго сям'я — жонка і чацвёра дзяцей — жылі на кватэры ў адной з вёсак недалёка ад заставы».

Марына ГУРАНДА.

З ГЕТА — У ДОМ

22 чэрвеня 41-га года, калі тэрыторыю сталі бамбіць, дзед тэрмінова адбыў у часць. Бабуля, Папова Праскоўя Цімафееўна, і дзеці: 10-гадовы Аляксандр, 8-гадовы Дзмітрый і 5-гадовыя двайняты Святлана і Тамара, як і многія сем'і вайскоўцаў, трапілі ў лагер для прымусовых перасяленцаў у Чарнаўчыцах. Жыццё ў тым гета было жудасным, харчоў фактычна не было. Дзеці хадзілі па ваколіцы ды жабравалі.

Праз нейкі час мясцовым жыхарам дазволілі браць на работу людзей з лагера. Маю бабулю з дзецьмі ўзяў да сябе Клім Філімонавіч Абрамук з вёскі Мачулішча. Іх у тым доме саміх было пяцёра, а яны яшчэ пяцярых узялі! Але, паводле правіл, работнікаў трэба было вяртаць у лагер. І немцы некалькі разоў іх забіралі. Але ж Клім Філімонавіч разам са сваім пажылым бацькам зноў прыязджаў ў Чарнаўчыцы і нейкім чынам зноў вызваляў сям'ю. Потым пра Паповых, відаць, забыліся ў лагеры. Словам, усю вайну бабуля з дзецьмі пражылі ў гэтых добрых людзей. Заставаліся яны ў Мачулішчы і яшчэ некаторы час пасля вызвалення...

Недзе ў 1949 годзе Праскоўя з дзецьмі паехала да родных у тады яшчэ горад Горкі. Яе муж лічыўся прапаўшым без вестак. І толькі праз шмат гадоў яго родныя даведаліся, што Рыгор Папоў загінуў 31 жніўня 1943 года ў Ярцаўскім раёне Смаленскай вобласці.

БЕЛАРУСКІ ДЗЕД КЛІМ

Доўгія гады бабуля і Клім Філімонавіч перапісваліся. Усе свае пісьмы ён звычайна пачынаў так: «Добры дзень, дарагая мая Цімафееўна. У першых радках свайго ліста паведамляю, што па літасці Божай усе мы жывыя і здаровыя. Чаго і вам жадаем...»

Кожны раз, калі мы збіраліся ў бабулі за сталом, яе дзеці ўспаміналі Беларусь, спявалі на беларускай мове: «Каля грэблі шумяць вербы», успаміналі суседзяў, знаёмых з вёскі Мачулішча. А дзед Клім (так мы яго між сабой называлі) прысылаў нам пасылкі з салам, дамашняй каўбасой, сушанымі грушамі. Так, відаць, у ім засталося з вайны жаданне — накарміць галодных дзяцей.

Далей у сваім лісце Марына Міхайлаўна, дачка Святланы, расказвае, як у дзяцінстве, у пачатку 70-х гадоў, яна з маці і бацькам прыязджала ў Мачулішча. Дзед Клім быў тады ўжо старэнькі. Ну а потым пісьмы з Беларусі перасталі прыходзіць. Зразумела, што людзі сыходзяць у іншы свет і сувязі перарываюцца.

Але Марына Гуранда, як і яе сваякі, беражліва захоўвае памяць. Унучка франтавіка планавала прыехаць у Камянецкі раён у маі, бліжэй да Дня Перамогі. Але паездка сарвалася з-за пандэміі. У сваім лісце расіянка прасіла кіраўніка мясцовай улады даведацца, ці ёсць у акрузе сваякі Кліма Абрамука, ці засталіся аднавяскоўцы, якія памятаюць ваенныя падзеі. Яе таксама цікавіла, хто даглядае магілы простых беларускіх сялян з вялікімі сэрцамі — людзей, якім расійская сям'я абавязана ўсім.

Праскоўя і Рыгор Паповы ў 1940 годзе.

СЯМ'Я ПАПОВЫХ

«Калі б не гэтая сям'я (Абрамукоў. — **Аўт.**), наш род перастаў бы існаваць у 1941 годзе», — напісала ў адным з лістоў унучка Праскоўі Паповай. Хутчэй за ўсё, яны раздзялілі б лёс вязняў Чарнаўчыцкага гета. Дзякуючы Абрамукам Праскоўя выжыла і з гонарам выканала сваю галоўную місію. Удава афіцэра-франтавіка адна ўзняла на ногі чацвярых дзяцей. Усе выраслі, атрымалі спецыяльнасці, сталі прыстойнымі людзьмі.

Дачка Рыгора і Праскоўі, Святлана Рыгораўна Таланава (Папова), стала кавалём-штампоўшчыкам, шмат гадоў працавала на Горкаўскім аўтазаводзе. Яе партрэт з ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, цэлым россыпам медалёў у пачатку 80-х надрукаваў часопіс «Савецкая жанчына». Тады ж у размове з карэспандэнтам Святлана Рыгораўна зноў згадвала сваіх беларускіх ратавальнікаў. І расказвала, як па вечарах любіць спяваць беларускія песні, якія засталіся з ёю з дзяцінства на ўсё жыццё.

Тамара, сястра Святланы, пасля школы скончыла ВНУ. Доўгі час узначальвала планавы аддзел будаўнічай арганізацыі. Аляксандр многія гады працаваў машыністам цеплавоза. Вось толькі Дзмітрый вельмі рана памёр. Цяпер у Расіі жывуць чацвёра праўнукаў і трое прапраўнукаў Рыгора і Праскоўі. Род працягваецца.

Ну а ў Мачулішчы, на жаль, не засталося нікога з сям'і Кліма Абрамука. Са старшынёй сельскага Савета Барысам Данілюком мы заехалі да адной са старэйшых жыхарак вёскі Веры Абрамук. Вера Уладзіміраўна аказалася цёзкай па прозвішчы, як нярэдка бывае ў вёсках. Яна нарадзілася ў 1942 годзе. Ваенныя гады не памятае, аб падзеях больш ведае з расказаў бацькоў. А вось Святлану і Тамару Паповых добра памятае, яны прыходзілі да яе старэйшай сястры. Паповы ж некалькі гадоў жылі тут і пасля вайны.

ГІСТОРЫЯ МІЛАСЭРНАСЦІ

— Памятаю іх маму, у нас у вёсцы яе лейтэнанткай называлі, — расказвае Вера Уладзіміраўна. — Праскоўя была прыгожай жанчынай, а працаўніцай, якіх пашукаць. Каб дзяцей пракарміць, хадзіла па хатах, усё рабіла: бульбу капала, жыта жала, агарод палола, ніякай работы не цуралася. А дзяцей таксама ў вёсцы шкадавалі, разумелі, без бацькі засталіся, да таго ж у чужым краі. Калі зойдуць да каго, пачаставаць стараліся. Які тады быў пачастунак — бульбіну, мо калі кавалак хлеба. Цяжка тады жылі... Але ва ўсіх у вёсцы засталіся добрыя ўспаміны пра гэтую сям'ю, добрыя людзі былі, таму ім так і памагалі.

— Але ж Клім і яго сям'я — гэта асаблівая гісторыя чалавечнасці і спагады, — гаворыць Барыс Данілюк. — Толькі ўявіце сабе: звычайная сялянская хата раздзелена на дзве палавіны. У іх жывуць два браты Марк і Клім. У адной палове, якая складаецца з двух невялікіх пакояў і кухні, жыве сям'я Кліма з пяці чалавек, у другім пакоі яны селяць сям'ю таксама з пяці чалавек. Так жывуць усю вайну і пэўны час пасля вайны. Дзеляцца не толькі жытлом, але і нярэдка ежай. А да гэтага Клім некалькі разоў едзе ў Чарнаўчыцы, каб забраць знаёмых з лагера, улагоджвае ахоўнікаў і канваіраў рознымі паднашэннямі. Яны ж пачынаючы з 1940 года жылі на кватэры ў Кліма. Таму і ратаваў як сваіх.

У Кліма было дзве дачкі — Надзея і Ніна. Нявесты пасляваенных гадоў, замуж не павыходзілі, дзяцей ніводная не мела. Ніна Клімаўна жыла ў доме, які пабудавалі на месцы былога бацькоўскага. Напрыканцы жыцця яна перапісала дом на знаёмых людзей, што падтрымлівалі яе ў старасці. Яны і даглядаюць магілы Кліма і яго родных. Так што магілы дагледжаныя. Дом, праўда, некалькі гадоў таму прадалі іншым людзям.

А ў суседняй вёсцы Зарэчча мы пазнаёміліся з 84-гадовым Уладзімірам Якаўлевічам Казырам, які ўспомніў сясцёр Паповых:

— Пасля вызвалення мы, пераросткі, пайшлі ў школу. Са мной у класе вучыліся Света і Тамара, мы ведалі, што гэта дочкі савецкага афіцэра, які загінуў у пачатку вайны. Тут такіх сем'яў многа было ў акрузе. Перад вайной у нашай памежнай зоне кругом часці стаялі, у вёсках афіцэры з сем'ямі жылі. Дзяўчынкі добрыя былі, старанныя, яны ў суседняй вёсцы жылі, да нас у школу хадзілі.

Мы спісаліся з Марынай Міхайлаўнай пасля маёй камандзіроўкі ў Мачулішча. Яна ўсё-такі плануе прыехаць у Камянецкі раён крыху пазней, калі дазволіць эпідэмічная абстаноўка. А пакуль жанчына вырабіла ў друкарні невялічкі буклет, прысвечаны сям'і бабулі і дзядулі і іх беларускім выратавальнікам. Некалькі экзэмпляраў адправіла ў Беларусь. Мне падалася яшчэ цікавай тая акалічнасць, што ў Ніжнім Ноўгарадзе Марына жыве ў доме па вуліцы Янкі Купалы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота аўтара і з архіва сям'і ПАПОВЫХ.

Белинвестбанк

Форма 1

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 октября 2020 г.

Открытое акционерное общество
«Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2020 год	2019 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		130 665	131 781
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		1	4
4	Средства в Национальном банке	1103		425 890	587 683
5	Средства в банках	1104		300 700	200 617
6	Ценные бумаги	1105		951 439	1 060 287
7	Кредиты клиентам	1106		2 781 788	2 235 929
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
9	Инвестиции в зависимые юридические лица			-	-
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица			-	-
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108		1 837	1 853
12	Основные средства и нематериальные активы	1109		172 083	171 947
